Пролетарыі усіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
штодзённая газэта

НЯДЗЕЛЯ 9 КАСТРЫЧНІКА 1932 г.
№ 2 4 (3603)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратара 4-78
Сэкцыяў . . . 6-15
Пачтая рэдакцыя 12-65 (два заняткі)
Выдавецтва . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце і ліставосцями.
Рукапісы не зьвяртаюцца.

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МІНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радок нонпарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
1 дакумэнту аб згубе 2 руб.

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ—ПЕРАДАВЫ: Дамагчыся рашучага пералому ў збожжаза гатоўках.
І. В-чэ Харчовыя канфэрэнцыі ўзьнімаюць новую хвалю актыўнасьці (3-ая стар.).
А. САКС: За яравізацыю сеі, лубіну і азімага ячменю. (2-ая стар.).
І. Л. ГАЛАЎНЕУ: Больш і лепшай якасьці тавараў шырспажыву на калгасныя рынкі (2-ая стар.).
ЯРМАШЭВІЧ: Дубовыя жалуды—сыравіна для спіртусовай прамысловасьці (2-ая стар.).
НЕ ПАКІНУЦЬ У ЗЯМЛІ НІВОДНАЙ БУЛЬБІНЫ. 1-ая стар.).
Прафсаюзы — актыўныя ўдзельнікі у барацьбе за павышэньне тэмпаў збожжазагатовак (1-ая стар.).
Партячэйкі і сельсаветы павінны ўз началіць барацьбу за рэалізацыю сацыялістычнага абавязацельства дэсятацкіх груп. (2-ая стар.).
Шырокім разгортваньнем сацспабор ніцтва забясьпечыць высокаякасную падрыхтоўку сяўбы. (3-ая стар.).
ДАЎГАНАЛАЎ: Рэлігія—зброя клясавага ворага (4-ая стар.).
ЛІСТЫ КАЛГАСЬНІКАЎ, СТУДЭНТАЎ І РАБОЧЫХ. (3-ая стар.).
Падводзім вынікі агляду нізавой ка апэраты (4-ая стар.).
ЗА ГРАНІЦАЙ. (4-ая стар.).

Дамагчыся рашучага пералому ў збожжазагатоўках

Кастрычнік зьяўляецца рашаючым месяцам у збожжазагатоўках па той прычыне, што імэнна зараз стварыліся найбольш спрыяючыя ўмовы для загатовак збожжа і фуражу. Заканчваецца ў асноўным абмалот збожжа, рэспубліка падыйшла шчыльна да зарэзэрвіраньня сяўбы. Перадавыя раёны БССР видучы збожжазагатоўкі пад дёзунгам заканчэньня гадавога пляну да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі—павінны паказаць у кастрычніку месяцы, зусім натуральна, выключныя тэмпы работы. Цэнтральная задача заключаецца ў тым, каб партыйныя арганізацыі і саветы мабілізавалі самыя шырокія колы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на спачасовае і поўнае выкананьне гадавога пляну. Кастрычнік павінен стаць месяцам штурмавой бальшавіцкай работы. Адсюль вынікае, што ў ходзе збожжазагатовак масавая работа та павінна быць узьнята на нябывалую вышыню.

Як-жа ідзе выкананьне гадавога пляну.

Паводле даных на 5 кастрычніка плян на БССР выкананы ўсяго на 35,3 проц. На 1-ая кастрычніка плян быў выкананы на 32,6 проц. Усяго 2,7 проц. прыросту за пяцідзёнку. Лічба, якая прымушае сур'ёзна непакоіцца. Элемэнтарная арытмэтыка паказвае, што пры такіх тэмпах прыросту мы ня здолеем да XV гадавіны Кастрычніка выканаць плян.

Хто-ж вінаваце крывую росту збожжазагатовак?

Калгасы МТС, выканалі гадавы плян на 62,4 проц., рэшта сыстэмы калгасаў выканала плян на 48,5 проц., а аднаасобны сэктар даў усяго толькі 24,5 проц.

Значыць, марудныя тэмпы у асноўным тлумачацца надзвычайна слабой масавай работай сярод аднаасобнікаў, зусім недастатковым націскам на кулацка-заможныя гаспадаркі, недастатковай масавай работай і у калгасах.

Да гэтага часу мы наглядаем агідныя факты, калі пагетарная норма здачы збожжа аднаасобнікамі ніжэй пагетарнай нормы суседніх калгасаў. Няма чаго і казаць, што гэта ёсьць парушэньне палітыкі партыі. Партыйныя і савецкія арганізацыі раду раёнаў і загатоўчая сыстэма іх ня ўлічылі прарэхаў першых крокаў загатовак гэтага году, калі на мясцох спусьцілі справу збожжазагатовак на самадёк. Вопыт лепшых калгасаў і МТС недастаткова выкарыстоўваецца. Агітацыя і прапаганда ня сталі яшчэ скрозь прадметныі і канкрэтныі. У БССР, ёсьць такія раёны, якія паказваюць, як трэба весьці загатоўкі, як трэба ўвязваць выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных задач з загатоўкамі збожжа і фуражу.

Зусім ня выпадкова тое, што перадавыя раёны у загатоўках нядрэнна, а ў большасьці выпадкаў нават і добра, вядуць сяўбу, скончылі ўборку і завяршаюць абмалот. Да гэтых раёнаў належаць Клімавіцкі, які выканаў плян на 69,4 проц., Лельчыцкі—66,0 проц., Тураўскі—61 проц., Дзяржынскі—59,4 проц., Каралінскі—55 проц., Камарынскі—52,5 проц., Смалявіцкі—52 проц., Жыткавіцкі—52 проц. (лічбы паданы на 1 кастрычніка).

Надзвычайна многа для посьпеху загатовак дае добра наладжаная работа саветаў. Няма патрэбы асабліва даводзіць, што гібкасьць сельсавецкага апарату масавая работа даюць пералом у загатоўках, а значыць і перамогу. Досыць падаць некалькі вартых перайманьня прыкладаў.

У Цыплянскім сельсавеце, Вузьдзенскага раёну, у сярэдзіне верасьня плян быў выкананы ўсяго толькі на 13 проц. Гэта выклікала трывогу. Савет, пад кіраўніцтвам мясцовай партыйнай групы, правёў пашыраны пленум, які ў поўным складзе абвясьціў сябе ударным і выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва Каменскі сельсавет. 8 штурмавых брыгад правялі сходы на вучастках, выпусьцілі спэцыяльныя насьценныя газэты, малатарні пачалі працаваць поўным ходам.

У выніку масавай работы, калі сельсавет стаў штабам усёй збожжазагатоўчай—плян па сельсавеце ўжо да 25 верасьня быў выкананы на 67 проц. Цяпер сельсавет напярэдадні выкананьня гадавога пляну.

Мы нядаўна на старонках «СБ» падавалі прыклад, калі асобныя актыўныя члены сельсавету садзейнічаюць выкананьню пляну збожжазагатовак. Прыкладам можа служыць член Старасельскага сельсавету, Рагачэўскага раёну, тав. Дарафееў, дзякуючы актыўнай рабоце якога сельсавет давёў выкананьне гадавога пляну да 8[illegible],8 проц., Наадварот, развал арганізацыйна-масавай работы Грузьдзінскага сельсавету, Быхаўскага раёну, быў прычынай ганебных тэмпаў загатовак.

У бліжэйшыя-ж дні павінен надыйсьці безадкладны і рэзкі пералом у ходзе збожжазагатовак. На асновe тых посьпехаў, якіх мы дамагліся ў калгасах МТС і ў перадавых раёнах, на аснове ўзросшай актыўнасьці шырокіх мас, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый саветы павінны ў першую чаргу ліквідаваць адставаньне аднаасобнага сэктару. Інфармацыі з месц сьведчыць між тым аб тым, што да аднаасобнага сэктару ўвага недастатковая. Растлумачваючы аднаасобніку ўсе перавагі спачасовага выкананьня гадавога пляну, трэба дамагчыся таго, каб аднаасобнік завяршыў абмалот збожжа і вывез хлеб на пункты. На загатоўчых пунктах, поруч з абслугаваньнем калгасьнікаў, неабходна палепшыць культурнае абслугоўваньне аднаасобніка. Вельмі многа можа зрабіць калгасны сэктар для арганізацыі посьпеху ў ходзе збожжазагатовак сярод аднаасобнікаў. Аднак, характарна, што на мясцох, дзе калгасны сэктар дамогся посьпехаў, вельмі часта мала зробле на для арганізацыі сацыялістычнага буксіру. Так, калгасы Кабыльшчанскага сельсавету перавыканалі плян, аднаасобны сэктар адстае. У перадавым Клімавіцкім раёне плян да канца верасьня на аднаасобным сэктары выкананы на 37 проц. Не сакрэт, што раёны, дзе лічба выкананьня гадавога пляну. не перавышае 10—11 проц., абавязаны гэтым адставаньнем у значнай ступені аднаасобнаму сэктару (Чавусы, Нароўля, Кармы Чырвонапольле).

Калгасы Быхаўскага і Слуцкага раёнаў у парадку адказу ленінградзкім рабочым узялі на сябе абавязацельствы выканаць гадавы плян да XV гадавіны Кастрычніка. Яны абавязаліся таксама падцягнуць аднаасобны сэктар. Гэтыя абавязацельствы павінны ператварыцца ў справу.

Саветы БССР! шырэй хвалю сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, у парадку сацыялістычнага буксіра падцягнем аднаасобны сэктар да ўзроўню посьпехаў перадавых.

Збожжазагатоўкі гэтага году праходзяць ва ўмовах заўзятай клясавай барацьбы. Месцамі рэшткі кулацтва, не абмяжоўваючыся падпольнай агітацыяй і раскраданьнем сацыялістычнай уласнасьці, вуснамі кулацкіх агентаў і падпявал видуць адкрытую агітацыю супроць здачы дзяржаве збожжа. У Дабрасьневіцкім сельсавеце, Магілёўскага раёну, гэта выявілася ў тым, што камісія садзейнасьці наўмысна зьменшыла індывідуальныя заданьні кулаком. Матывам служыла тое, быццам у вёсцы Ямніках няма кулакоў.

Бязьлітасна прыдушаючы спробы кулацтва і яго агентуры супраціўляцца збожжазагатоўкам, неабходна рашуча выкрываць і давяць бальшавіцкі адпор правым апартуністам, якія скаціліся на пазіцыі кулацкай контр-рэвалюцыі. **ЗБОЖЖА ПА ЦЬВЁРДЫХ ЗА ДАНЬНЯХ ПАВІННА БЫЦЬ АТРЫМАНА БЕЗАДКЛАДНА.**

Забясьпечыць посьпех у збожжазагатоўках—гэта значыць у першую чаргу актывізаваць работу чізавых, партыйных і савецкіх, арганізацый **Перамом у тэмпах павінен надыйсьці зараз-жа.** Саветы пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый павінны стаць штабамі загатоўчай кампаніі. Кожная партыйная ячэйка павінна зрозумець усю палітычную і народнагаспадарчую важнасьць, усю адказнасьць у справе правядзеньня збожжазагатовак.

Бязьлітасна змагаючыся а самымі язначнымі праявамі дэмабілізацыйных настрояў, з праваапартуністычным самацёкам, з разгаворамі аб нерэальнасьці плянаў, якія дзярэгулюючь збожжазагатоўкі, неабходна адначасова даваць бязьлітасны адпор усім тым, хто паспрабуе падмяніць шырачайшую мабілізацыю мас «ляванкім» адміністраваньнем.

Выкарыстоўваючы ўсе перавагі збожжазагатовак гэтага году, разгортваючы масавую работу, ламаючы супраціўленьне клясавага ворага—дабіваемся выкананьня ў тэрмін месячнага і гадавога пляну збожжазагатовак.

Не пакінуць у зямлі ніводнай бульбіны

9 кастрычніка

Зводка НКЗБ на 5 верасьня сыгналізуе аб недапушчальна марудных тэмпах уборкі бульбы па БССР. Ня гледзячы на тое, што падыйшлі прымаразкі і што ў бліжэйшыя дні чакаецца рэзкае пахаладнаньне, агульны плян бульбаўборкі выкананы толькі на 64,7 проц. Засталося яшчэ ўбраць 215.444 га бульбы.

Асноўная прычына адставаньня—гэта няўменьне спалучыць розныя сельска-гаспадарчыя работы, адсутнасьць імпэратыўнага кіраўніцтва з боку мясцовых саветаў і партячэек. Саветы павінны адыграць кіруючую ролю ў правядзеньні ўборкі ўраджаю бяз страт. ЦВК БССР у сваёй пастанове «Пра задачы саветаў у справе ўборкі бульбы, асеньня-пасеўнай кампаніі, падняцьці зябу і аб вынніках работы саветаў па ўборачнай, прапанае саветам прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні ўборкі ўраджаю, у прыватнасьці, бульбы. Мясцовыя саветы павінны арганізаваць дапамогу саўгасам, калгасам і калгасам у ліквідацыі прарыву па ўборцы. Усе РВК і саветы павінны забясьпечыць сапраўдную дапамогу ў правядзеньні ўборкі бульбы і гародніны.

Там, дзе саветы стаяць у баку ад правядзеньня ўборкі, дзе барацьба са стратамі не пастаўлена ў цэнтры ўсяе работы партыйных, савецкіх і земельна-калгасных арганізацый,—там мы маем значнае адставаньне па ўборцы бульбы. Толькі гэтым можна тлумачыць тое, што Асьвейскі раён выканаў плян на 27,6 проц., Чашніцкі—33,3 проц., Камарынскі—33,9 проц., Віцебскі—37,1 проц., Полацкі—41,9 проц.

Пры наяўнасьці ўмелага кіраўніцтва з боку саветаў ходам уборкі, уборка бульбы праводзіцца пасьпяхова. Гэта паказалі на практыцы перадавыя раёны, якія набліжаюцца да завяршэньня ўборкі. Так, Церахаўскі раён выканаў плян на 94,6 проц., Жыткавіцкі—90,8 проц., Парыцкі—87,9 проц., Брагінскі—87,8 проц.

Бліжэйшыя дні павінны стаць рашаючымі ў правядзеньні ўборкі бульбы. Мясцовыя саветы і партячэйкі павінны ашуча дапамагчы ў правядзеньні ўборкі. Трэба арганізаваць шырокую ўзаемадапамогу адстаючым гаспадаркам з боку перадавых. Неабходна шырока практыкаваць пасылку буксірных брыгад перадавых гаспадарак у адстаючыя, трэба шырока папулярызаваць узаемадапамогу адстаючых саўгасам і калгасам з боку сялян аднаасобнікаў, калгасьнікаў, рабочых і служачых.

Ліпеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б даў выразную лінэю тыву аб правядзеньні барацьбы са стратамі ўраджаю. Пры ўборцы бульбы барацьба са стратамі мае выключнае значэньне. У многіх мясцох калгасы і саўгасы абмяжоўваюцца толькі ўборкай бульбы з карчоў, перазворазьньне бульбяніча не праводзіцца. У выніку гэтага ў зямлі застаецца ад 20 да 25 проц. ўраджаю і мы недастрымліваем вялікія запасы харчовых і кармовых рэсурсаў.

Сёлета мы ставім пытаньне ва ўпор: НІ ОДНАГА ГА БУЛЬБЯНІЧА НЕ ПАВІННА ЗАСТАЦЦА НЕ ЗАБАРАНАВАНЫМ І НЕ ПЕРААРАНЫМ. Адначасова з уборкай бульбы трэба арганізаваць перавораньне бульбяніча. Усякім апартуністычным разважаньням аб конт таго, што «ўперад скончым усе работы, а пасьля прыступім да перавораньня бульбяніча», трэба даць рашучы адпор. Так можа разважаць толькі клясавы вораг—кулак.

Саветы і партячэйкі павінны стаць сапраўднымі барацьбітамі за поўнае захаваньне ўсяго ўраджаю бульбы. У бліжэйшыя дні трэба цалкам скончыць уборку бульбы і перавораньне бульбяніча. Не даць заціхнуць ад прымаразкаў, не пакінуць у зямлі ніводнай бульбіны.

Мэханізацыя ўборкі ігнаруецца, барацьба са стратамі не вядзецца

КРУПКІ.

Паводле пляну, па раёне павінна быць выкапана 8354 га бульбы, між тым на 5 кастрычніка выкапана толькі 4760 га або 56,9 проц. пляну.

Ня гледзячы на ганебныя тэмпы ўборкі, з боку райкалгасаюзу, МТС і райза ня ўжыты адпаведныя захады для хутчэйшага скончэньня ўборкі бульбы. Райза ня ведае дакладнага уліку ўборкі бульбы па сельсаветах і калгасах, не арганізавана дапамога ад стачочым калгасам.

У радзе калгасаў не вядзецца барацьба са стратамі. У калгасе «Чырвоны араты», Пружанцкага сельсавету, пасьля капаньня цмат бульбы застаецца ў зямлі. Такое самае становішча наглядаецца і ў калгасе «Усход», Жабярыцкага сельсавету.

У раёне яўна ігнаруецца мэханічнае капаньне бульбы. Па радзе калгасаў бульбакапалкі стаяць без работы. 20 бульбакапалак стаіць на складзе Белсельснабу; аб'яраўшы машын у калгасы дыракцыя ня турбуецца.

Ударнае скончэньне бульбаўборкі і адгрузка яе—баявая задача партыйна-камсамольскіх арганізацый і ўсёй грамадзкасьці Крупшчыны.

Ліпёў.

Аб ходзе ўборкі бульбы па раёнах БССР
Зводка НКЗБ на 5 кастрычніка

	Плян	Убрана	Проц. выкан.	У тым ліку: Калгасы	Саўгасы	Аднаасоб.
На 30-IX 1932 г. было	609948	284796	46,7	30,7	26,2	59,1
На 5-X 1932 г. было	„	394504	64,7	47,3	40,2	79,1
На 5-X. 1931 г. было	576085	158917	27,6	22,1	14,2	30,8

Назва раёнаў	Проц. выкананьня	Назва раёнаў	Проц. выкананьня
Паўночная зона		Слуцкі	57,5
Гарадоцкі	68,8	Крупскі	56,9
Сіроцінскі	66,9	Бягомльск	55,1
Вушацкі	66,2	Крычаўскі	54,0
Аршанскі	60,3	Талачынскі	50,3
Расонскі	58,8	Мсьціслаўскі	51,3
Лепельскі	55,8	Лагойскі	47,0
Сураскі	52,4	Бялынічскі	46,7
Сеньненскі	46,2	Горацкі	43,4
Дрысенскі	45,7	Капыльскі	42,7
Бешанковіцкі	45,3	Разам па зоне	64,4
Дубровенскі	45,2	**Паўднёвая зона**	
Лёзьненскі	44,2	Церакаўскі	94,4
Полацкі	41,9	Жыткавіцкі	90,8
Віцебскі	37,1	Парыцкі	87,9
Чашніцкі	33,3	Брагінскі	87,8
Асьвейскі	27,6	Петрыкаўскі	87,5
Разам па зоне	51,4	Тураўскі	87,4
Цэнтральная зона		Рагачоўскі	87,0
Быхаўскі	84,8	Лоеўскі	84,6
Старадарожскі	78,4	Карматскі	84,2
Чырвонапольскі	77,2	Лельчыцкі	79,2
Шклоўскі	78,0	Старобінскі	78,5
Касьцюковіцкі	76,8	Чачэрскі	78,3
Чавускі	76,7	Ельскі	75,0
Магілёўскі	76,7	Веткаўскі	74,3
Чэрыкаўскі	74,6	Гаўскі	73,7
Пухавіцкі	69,3	Жлобінскі	73,3
Барысаўскі	68,4	Бабруйскі	72,1
Вузьдзенскі	68,5	Гомельскі	70,3
Бярэзінскі	68,5	Маларскі	70,5
Чырвонаслабодзкі	68,2	Рачынкі	68,8
Чэрвеньскі	68,1	Буда-Кашалёўскі	68,5
Асіпавіцкі	67,1	Парафянскі	67,0
Заслаўскі	66,7	Любанскі	66,8
Менскі	66,1	Хойніцкі	63,7
Смалявіцкі	65,8	Уваравіцкі	60,9
Плешчаніцкі	64,0	Камарынскі	33,9
Клімавіцкі	58,7	Разам па зоне	73,4
Клічаўскі	5[illegible],5		
Дзяржынск	57,9	Усяго па БССР	64,7
Прапойскі	57,9		

Пасеўбюро НКЗБ

Дрэнная арганізацыя працы—прычына прарыву

ШКЛОЎ. Паводле пляну ў раёне павінна быць выкапана 9.704 га бульбы. На 5 кастрычніка выкапана толькі 7.570 га, што складае 78 проц засеву. Паасобныя калгасы недапушчальна запаволваюць капаньне бульбы. Так, у калгасе «Шлях пралетарыяту», Чарнянскага сельсавету, з 20 га выбрана толькі 3. Прычынай гэтага зьяўляецца тое, што ў калгасе не арганізавана праца, рабочая сіла нерацыянальна расстаўлена на вучастках.

Тэрміны скончэньня капаньня бульбы ўжо прайшлі. Неабходна ўсім адстаючым у капаньні бульбы калгасам Шклоўскага раёну ў бліжэйшыя дні нагнаць упушчанае, павесьці барацьбу са стратамі з крадзяжкай і дамагчыся пералому ў бульбакапаньні.

Лебедзеў.

100 проц. гадавога пляну збожжазагатовак да ХУ гадавіны Кастрычніка

Прафсаюзы--актыўныя ўдзельнікі
Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ПАВЫШЭНЬНЕ ТЭМПАЎ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

Разгортваньнем сацспаборніцтва, павышэньнем прадукцыйнасьці працы работнікаў загатпунктаў, лепшым абслугоўваньнем здатчыкаў збожжа, арганізацыяй буксірных брыгад—адкажам на пастанову прэзыдыуму ЦСПСБ

Узмацніць удзел прафарганізацый у збожжазагатоўках

(З пастановы ЦСПСБ).

Заслухаўшы даклад тав. Журомскага і садакład тав. Штэйнгольца аб ходзе збожжазагатовак прэзыдыум ЦСПСБ прызнаў тэмпы збожжазагатовак зусім нездавальняючымі, асабліва ў апошнія пяцідзёнкі верасьня. На 25 верасьня г. г. загатоўлена толькі 16779 тон збожжа або 24,2 проц. супроць 18.015 тон га на гэты-ж часу мінулым годзе, ня гледзячы на тое, што плян збожжазагатовак г. г. паменшаны на 30 проц.

Па ранейшаму недапушчальна адстае аднаасобны сэктар, які выканаў плян на 25-ЗХ толькі на 14,7 проц. Яшчэ горш абстаіць справа з спаганяньнем цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак, якія злосна ўхіляюцца ад выкананьня пляну збожжазагатовак і вядуць шкодніцкую агітацыю сярод аднаасобнікаў.

Такое становішча сьведчыць аб тым, што Рай і Гарпрафсаветы, ЦП аднаведных саюзаў і загатоўчыя арганізацыі яшчэ не зрабілі належнага пералому ў сваёй рабоце, не мабілізавалі прафарганізацыі на пасьпяховае правядзеньне гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Культурна-бытавое абслугоўваньне збожжазагатоўчыкаў да сёньняшняга дня застаецца зусім нездавальняючым. Узятыя абавязкі па дагаворах, заключаных з Белканторай «Загатзерне», Белкаапсаюзам, Белдзяржгандлем і Наркамасьветы ня выкананы. ЦП саюзаў працасьветы, фінбанкаўскіх работнікаў, кашгарацы, дзяржгандлю і працмастацтва не ўстанавілі кантролю за выкананьнем заключаных дагавораў і не аказалі практычнай дапамогі ў правядзеньні прынятых на сябе на дагаворам абавязацельстваў.

Ня гледзячы на дырэктывы партыі і ўраду аб забароне гандлю збожжам да поўнага выкананьня пляну збожжазагатовак, г. зн., з 15 ліпеня 1933 г., усё-ж наглядаецца гандаль збожжам у некаторых мясцох. Але ніякіх захадаў з боку мясцовых арганізацый для таго, каб спыніць гандаль збожжам ня прымаецца. ЦП саюзаў харчосрэдна зьвязаны з вёскай: МХКП МТС і батрацтва, працасьветы, медсанпрацы, жывёлагадоўных саўгасаў, кашгарацы, дзяржгандлю і фінбанкаўскіх работнікаў не правяла шырокай масавай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў па растлумачэньні пастановы ЦВК і СНК аб здачы збожжа ў ліквідацыі чырвоных абозаў, перадачы вопыту перадавых адстаючым калгасам, сельсаветам і прымяненьні мэтадаў грамадзкага буксіру.

Прэзыдыум ЦСПСБ прапануе Белканторы «Загатзерно» пад асабістай адказнасьць тав. Журомскага, ЦП саюзаў і Рай і Гарпрафсаветаў у самым тэрміновым парадку праверыць дакладнае выкананьне гаспадарак і іх выкананьне, прыцягваючы да судовай адказнасьці тых, якія злосна ўхіляюцца ад выкананьня цьвёрдых заданьняў і арганізуючы над імі паказальныя працэсы. Праверка выкананьня цьвёрдых заданьняў павінна праходзіць пры непасрэдным удзеле камісій садзейнасьці.

Асабліва важныя задачы стаяць перад Белканторай «Загатзерно» і ЦП саюзу МХКП у сэнсе рашучага палепшаньня работы прыёмачных пунктаў шляхам зьнішчэньня чаргі, затрымкі ў разьлёках, забясьпечаньня пунктаў і прыпоўных кас працыма і недапушчэньня запазычанасьці па здачы збожжа.

Адзначаючы паступленьне на загатпункты ў значнай колькасьці нядабраякаснага і засьмечанага чорным ражком збожжа, што зьяўляецца вынікам адсутнасьці адпаведнай растлумачальнай работы з калгасьнікамі і аднаасобнікамі, прэзыдыум ЦСПСБ прапануе Белканторы «Загатзерно» і ўсім ЦП саюзаў, зьвязаных з вёскай, зараз-жа правесьці шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў вакол пастановы ЭКАСО аб здачы (продажы) дзяржаве толькі кандыцыйнага збожжа. Адначасова ўзмацніць нагляд за прыёмкай добраякаснага збожжа на загатпунктах, не дапускаючы прыёмкі некандыцыйнага збожжа без прымяненьня рэфакцыі ў адпаведнасьці з існуючымі падажнікам.

Браць прыклад з Баеўскага сельсавету

КРЫЧАЎ. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Плян збожжазагатовак на 1-X па Крычаўскім раёне выкананы на 42,5 проц. Узорную барацьбу за спачасовае выкананьне пляну збожжазагатовак паказваюць калгасьнікі Баеўскага сельсавету. Там калгасьнікі выканалі 90 проц. пляну, аднаасобнікі—33,3 проц., а па цьвёрдых заданьнях—63,2 проц., Увесь плян па сельсавеце выкананы на 86,7 проц. Баўскі сельсавет, які знаходзіцца на першым месцы па выкананьні пляну збожжазагатовак, прымае ўсе захады каб ня здаць перадавым пазыцыі. Калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі ўсіх сельсаветаў павінны і могуць пайсьці па прыкладзе Баеўскага сельсавету.

30 верасьня ў гонар пленуму райвыканкому калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі арганізавалі чырвоныя абозы імя пленуму райвыканкому са збожжам і бульбай. Усяго збожжа было здана 37 тон.

З трыбуны пленуму дэлегаты пленуму—старшыні сельсаветаў, старшыні калгасаў, калгасьнікі і ўдарнікі сацыялістычных палёў—заявілі, што яны абавязуюцца да дню калектывізацыі і ўраджаю—14 кастрычніка здаць ня менш 70 проц. пляну збожжазагатовак і выканаць 100 проц. пляну да Кастрычніцкіх сьвят.

Ч—скі.

У радох перадавых

▲ ЕЛЬСК. (Белта). Гадавы плян збожжазагатовак па калгасах Скародняньскага сельсавету на 25 верасьня выкананы на 116 проц. Толькі за адну дэкаду тэмпы загатовак па аднаасобным сэктары ўзьняліся з 3,3 проц. да 45,1 проц. Перадавіком ў гэтай справе зьяўляецца калгас «Варашылаў», які выканаў гадавы плян на 139 проц.

Гэта зьяўляецца вынікам пасьпяховай работы партячэйкі, якая арганізавала спэцыяльныя брыгады і прымацавала іх да вучасткаў сельсаветаў. Паміж брыгадамі, вучасткамі і паасобнымі камуністамі было разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва.

▲ БЯЛЫНІЧЫ. У адказ на ліст ленінградзкіх рабочых калгас «Камінтэрн», М.-Кудзінскага сельсавету 30 верасьня цалкам выканаў гадавы плян збожжазагатовак, здаўшы (пранаўшы) дзяржаве 9 тон збожжа. Адстаючыя калгасы павінны раўняцца па калгасе «Камінтэрн».

Талачынская МТС слаба змагаецца за збожжа

Задача, якая стаіць перад МТС у справе разгортваньня збожжазагатовак, надзвычайна вялікая і адказная.

Як-жа Талачынская МТС мабілізавалася на правядзеньне гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі? Як яна расставіла сілы на такім адказным вучастку, як барацьба за збожжа?

Замест 100-процантнага выкананьня пляну збожжазагатовак да 1 кастрычніка, цлян па калгасах МТС выкананы толькі на 65,8 проц. Паасобныя вучасткі, як Азерацкі, плян зярнёвых выканаў на 66,8 проц., Воўкаўскі—толькі на 50 проц., адстае таксама і Коханаўскі, які даў 69,7 проц. пляну і Сіманаўскі—70,3 проц.

Няма кіраўніцтва гэтымі вучасткамі з боку МТС Паасобныя загадчыкі вучасткаў, як Жылінскі Ладышкін, Вакер, Цярэпчанка, не адчуваюць ніякай адказнасьці. Некаторыя з іх зусім рэдка бываюць на вучастках (Жылінскі, Ладышкін), ня цікавяцца справай збожжазагатовак. Ніякай масава-растлумачальнай работы ў калгасах не праводзіцца. Пастанова партыі і ўраду аб збожжазагатовак не распрацавана.

Рад калгасаў гэтых вучасткаў ня выканалі нават і паловы заданьня: калгас «Набат»—27 проц., «Ударнік»—16 проц. (Азерацкі вучастак), «Ленінскі шлях»—22,6 проц., «Чырвоны асьветнік»—25,4 проц., імя Сталіна—46,6 проц., «VII зьезд саветаў»—38 проц. (Воўкаўскі вучастак). Гэтыя калгасы знаходзяцца ў паласе глыбокага прарыву ў справе выкананьня збожжазагатовак. Задача МТС заключаецца ў тым, каб мабілізаваць усе сілы калгасьнікаў на баявое заканчэньне абмалоту збожжа з тым, каб у бліжэйшыя дні поўнасьцю выканаць збожжазагатоўчыя пляны.

Разам з адстаючымі калгасамі ёсьць і перадавікі ў выкананьні пляну збожжазагатовак, якія за апошнія дні паказалі сапраўды бальшавіцкія тэмпы, як у абмалоце, так і ў здачы збожжа. Гэтыя калгасы на справе давялі рэальнасьць пляну.

Вось тыя, хто зразумеў баявы лёзунг партыі, «барацьба за збожжа—барацьба за сацыялізм»: калгас «Багданаўка», (Коханаўскі сельсавет) выканаў заданьне па зярнёвых на 171,6 проц., «Кастрычнік»—на 117,9 проц., «Забайкал» (Пыравалацкага сельсавету)—на 104,5 проц.

Талачынская МТС павінна ўзначаліць барацьбу за збожжа, мабілізаваць усе сілы на заканчэньне збожжазагатовак у бліжэйшыя дні.

Хв. Шылівонаў.

Чырвоны абоз са збожжам у гонар прызыву, 1910 году нараджэньне. (Лёзьненскі р—н).

Уступім у другую пяцігодку з новымі посьпехамі на фінансавым фронце

ЦК КП б)Б—тав. Гікало
СНК БССР—тав. Галадзеду
ЦСПСБ--тав Кавальчуку

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай Партыі, дзякуючы разгорнутай масавай працы, пры шырокім удзеле прафсаюзнай масы і ўдарнікаў фінансавага фронту, БССР дабілася новай перамогі: ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ 3-га КВАРТАЛУ (102,9 проц., а пры ўліку паступлення самаабкладання—108,8 проц.). Гэтай перамогай БССР завяршае гадавіну выкананьня і перавыкананьня фінпляну па мабілізацыі сродкаў на сельніцтва. Звыш 30 раёнаў дабіліся датэрміновага выкананьня і перавыканаьня квартальнага пляну. Сярод іх раёны: Заслаўскі, Жыткавіцкі, Мсьціслаўскі, Сіроцінскі і пралетарскія цэнтры—Менск, Гомель, Віцебск, якія на працягу усяго году паказваюць бальшавіцкую барацьбу за фінплян і з кварталу ў квартал перавыконваюць плян. Разам з тым адзначаем раёны: Веткаўскі, Бярэзінскі, Глускі, Кармянскі, Лоеўскі і Асьвейскі, якія систэматычна зрываюць выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў.

Завяраем Партыю і Ўрад, што не паслабім барацьбу за мабілізацыю сродкаў на сацыялістычнае будаўніцтва. Пад кіраўніцтвам Партыі, пры удзеле ўсёй савецкай грамадзкасьці ўступім у другую пяцігодку вялікага сацыялістычнага будаўніцтва з новымі посьпехамі на фінансавым фронце.

За Наркамфін БССР **Абрамсон**

ЦП Саюза Фінбанкаўскіх Работнікаў **Гераўкер.**

А Сакс

За яравізацыю соі, лубіну і азімага ячменю

Перад сельска-гаспадарчай вытворчасьцю БССР партыяй і ўрадам ва ўсю шырыню пастаўлена пытаньне аб хутчэйшым вырашэньні праблемы «расьлінага бялка» і стварэньня мацнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Адным з магутных падважнікаў дасягненьня гэтага сацыялістычнага заказу можа выяўляцца «яравізацыя» некаторых с.-г. культур.

«Яравізацыя»—гэта ёсьць спосаб скарачэньня працяжнасьці вегетацыйнага перыяду расьлін шляхам асобнай апрацоўкі слаба прарослых сямян да пасеву.

Пры вырашэньні праблемы расьлінага бялка ў БССР, акрамя культуры гароху, фасолі, бабоў, і інш, вялікую ролю павінна адыграць соя і безалькалёідны лубін. Сусьветны фэнамэн—безалькалёідны лубін знойдзен упершыню ў БССР на Менскай селекцыйнай станцыі ў 1931 г. па ініцыятыве ВІР'а селекцыянэрам Фядотавым В. С. Гэтае адкрыцьцё мае сусьветна-гістарычнае, бо безалькалёідны лубін, зжэрты ўсе іншыя яго сьці лубінаў, ня ўтрымлівае ў сябе гарачы (лубінае атруты) і можа ісьці на харчаваньне і на корм. Як відома, лубін вельмі нетрабавальная расьліна і дае вялікія ўраджаі зерня нават на пустых глебах, у чым ён зьяўляецца перакрыстам сярод усіх вяломых бабовых расьлін. Пры параўнаньні мадой патрабавальнасьці лубіну да глебы ён зьяўляецца вельмі капрызным культурай пры хаваньні ўраджаю. Зерне лубіну лёгка пакрываецца цывільнюю, губляе сваю ўсходжасьць, кармавую вартасьць і галоўным чынам (з-за высокай вільготнасьці зерня і саломы), пры ўборцы. Таму для нас вельмі важна ва ўмовах БССР, дзе да канца лета звычайна назіраецца лішак ападкаў, вывесьці больш скарасьпелыя гатункі лубіну альбо прымусіць шляхам яравізацыі тыя, што ўжо ёсьць, гатункі лубіну, высьпяваць раней. Больш раньняя ачыстка адгуджаю поля і ўборка ў сухі час маюць вялізарнае практычнае значэньне. Нашы вопыты 1932 г. па яравізацыі сінага аднагадовага лубіну, у якім знойдзен і безалькалёідны улубін, пры пасеве 12-У далі наступныя вынікі:

Варыянт	Дзён ад пасеву да сьпелості	Паскоранае ў дзёх	Ураджай зерня ў процантах	Прыбаўка ўраджайнасьці пры яравізацыі
Без яравізацыі . .	101	—	100	—
Яравізаваны	95	6	110	10

Яравізацыя лубіну заключалася ў вытрымліваньні лёгка прарослых сямян на працягу сямі дзён пры тэмпэратуры 12° С у цемнаце. Як бачым, нават пры нятоўнай яравізацыі сіні лубін паскорыў сваё разьвіцьцё на шэсьць дзён і ўраджай зерня пры яравізацыі некалькі падвысіўся. Гэты вынік паказвае, што лубін паддаецца яравізацыі і, значыць, распрацаваўшы мэтодыку яравізацыі, зможам сіні лубін зрабіць больш скарасьпелым.

Як відома, большасьць гатункаў соі ў БССР у звычайныя гады не высьпяваюць і моцуць разводзіцца толькі в вацоць і на сілос. Таму прывознага насеньня на сілос. Таму вывядзеньне скарасьпелых гатункаў соі і яравізацыя гэтай культуры павінна адыграць рашаючую ролю пры увядзеньні яе ў БССР. Нами ў 1932 г. была яравізавана беларускоўская соя № 026; пры яравізацыі гэты гатунак соі высьпеў на 22 дні раней, чым без яравізацыі. Яравізацыя соі заключалася ў вытрымліваньні слаба прарослых зернят ў цемнаце пры тэмпэратуры 23°—27° С на працягу 7 дзён.

Распрацаваўшы дэтальна мэтодыку яравізацыі соі мы зможам прымусіць высьпяваць у БССР вялікі асартымэнт такіх гатункаў соі, якія вельмі ўрад жайлівыя, але звычайна ў клімацічных умовах БССР не высьпяваюць.

У кармовым і харчовым балянсе не малаважную ролю ў БССР адыгрывае ячмень.

Усе азімыя ячмяні слаба зімастойкі і пры асеньнім пасеве ў БССР у часе адмоўкі звычайна гінуць. Пры пасеве-ж азімага ячменю ўвесну, ён не выкалашваецца. Калі-ж азімы ячмень яравізаваць і высеяць яго ўвесну, дык выходзіць, што ён высьпявае аднача сова з яравым ячменем, а па ўрад жайнасьці і якасьці ўраджаю ў шмат разоў перавышае наш яравы стандартны ячмень Вінэра. Нашы досьледы 1932 г. (і 1930 г.) па яравізацыі азімых ячменяў далі наступнае:

Гатунак	Ураджай зерня ў процантах	Прыбаўка ў процантах	Вага 100.0 зерня ў грамах	Дзён ад пасеву да сьпелості
Яравы ячмень Вінэра	100	—	41,9	85
Яравізаваны азімы ячмень № 45	187	87	40,0	89
Яравізаваны азімы ячмень № 79	158	58	44,0	88
Яравізаваны азімы ячмень № 44	143	43	34,4	92
Яравізаваны азімы ячмень № 81	108	8	46,4	82

Яравізацыя заключалася ў вытрымліваньні лёгка прарослых зернят азімага ячменю пры тэмпэратуры 0° С 30-48 дзён. Як бачым, паказаныя яра заваныя чыстыя лініі азімага ячменю пры веснавым пасеве пасьпелі аднача сова з яравым гатункам Вінэра, а па ўраджайнасьці зерня некаторыя гатункі перавышаюць Вінэра на 87 проц., 58 проц. і г. д. Па буйнасьці зерня яравізаваныя азімыя ячмені ня ўступалі Вінэру, а лінія 81 і 79 нават больш буйназернявыя.

Праблема яравізацыі с.-г. культур яшчэ слаба вывучана; яравізацыя соі была пачата толькі ў 1931 г. выдатным аграномам Лысенкам. Яравізацыя лубінаў упяршыню пастаўлена намі ў 1932 г. Масавая мэтодыка яравізацыі патрабуе яшчэ далейшай распрацоўкі і спрачэньня, што магчыма выканаць у найкарацейшыя тэрміны толькі пры шырокім удзеле ў гэтай рабоце ўсіх спэцыялізаваных інстытутаў і станцый па сваіх культурах і шырокіх колаў аграномаў МТС, саўгасаў, самых калгасьнікаў і рабочых саўгасаў

ПАРТЯЧЭЙКІ І СЕЛЬСАВЕТЫ

павінны ўзначаліць барацьбу за рэалізацыю сацыялістычных абавязацельстваў дэпутацкіх груп

7 лістапада заслухаем рапарт Гомсельмашаўкай дэпутацкай групы

Ліст ленінградзкіх рабочых, а таксама маскоўскіх дэпутатаў спатканы новай хваляй творчай ініцыятывы рабочых і калгасных мас.

Дэпутацкая група Гомельскага гарсавету, заводу Гомсельмаш, разам з усім рабочым калектывам горача спаткала гэты ліст і на баявы заклік пралетараў адказала радам сацыялістычных самаабавязацельстваў у гонар XV гадавіны.

Дэпутацкая група ўзначаліла шырока - разгорнутую барацьбу за пасыпяховае выкананьне прам фінпляну, шляхам укараненьня сацыялістычных мэтадаў і адносін да працы. Асноўная ўвага дэпутатаў зьвернута на забясьпечаньне заводу сыравінай базай. Гэта пытаньне цесна ўвязана з работай дэпутацкіх груп прадпрыемстваў, якія пастаўляюць сыравіну.

Па ініцыятыве дэпутатаў разгорнута вялікая работа па рэалізацыі рабочых прапаноў і па барацьбе за якасьць прадукцыі.

Аўладаньне тэхнікай пастаўлена асноўнай задачай дэпутацкай групы і ўсяго рабочага калектыву. Дэпутацкая група стварыла спэцыяльную брыгаду для дапамогі ў разгортваньні тэхвучобы сярод рабочых. Гэта пытаньне цесна ўвязваецца з асваеньнем выпуску сіласарэзкі «Інтарнэцыянал». Гэтымі днямі будзе створана брыгада ІТР, якая будзе ўсямерна дапамагаць рабочаму калектыву асвойваць тэхніку.

У справе мабілізацыі сродкаў дэпутацкая група вяла шэфства над апчэдкасай, выпучыла брыгаду ў дапамогу выкананьню фінпляну з мэтай выканаць да 7-га лістапада фінплян 4-га кварталу на 50 проц. Дэпутаты Гомсельмашу стварэлі ўнутрызаводзкі пост па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

У галіне рабочага забясьпечаньня дэпутацкая група бярэ пад неаслабны кантроль усе крыніцы загатовак прадуктаў і аказвае ўсямерную практычную дапамогу ў пашырэньні пагалоўя сьвінарнікаў і трусатнікаў пры сталовай заводу і ЗРК.

Дэпутаты арганізавалі выхады рабочых на ўборку гародніны і бульбы ў калгасах, дапамаглі ў асеньняй сяўбе. Яны ўзначалілі барацьбу са стратамі ў час бульбабуёрыкі і дамагаюцца захаваньня ўраджаю ў цэласьці.

Ход барацьбы за выкананьне сацыялістычных самаабавязацельстваў дэпутацкая група будзе сыстэматычна асьвятляць на старонках насьценнага, раённага і цэнтральнага друку.

А. Кр.

Крупшчына прыступіла да рэалізацыі самаабавязацельстваў

КРУПКІ. Дэпутаты і сэкцыянэры Крупшчыны дасканальна рас працавалі і прынялі зварот пралетараў чырвонай сталіцы і адказваюць на яго сацыялістычнымі самаабавязацельствамі.

Калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі пад кіраўніцтвам дэпутатаў і сэкцый саветаў абавязуюцца да 7-га лістапада выканаць пляны загатовак па зборцы і бульбе. Выканаць 70 проц. пляну загатовак лёнавалакна.

Дэпутаты сельсавета ўзялі пад неаслабны кантроль будаўніцтва сьвінарнікаў, кароўнікаў і бульбасховішчаў, аказваючы усямерную практычную дапамогу у завяршэньні будаўніцтва па калгасах і саўгасах раёну.

Дэпутацкія групы ўзначалілі барацьбу за выкананьне і перавыкананьне пляну дарожнага будаўніцтва. Дэпутаты і сэкцыянэры сумесна з прызыдумам Крупскага РВК абавязаліся шырэй разгарнуць калгасны гандаль, шырока папулярызуючы аб гэтым пастановы партыі і ўраду сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў. Прыняты меры для правядзеньня самай жорсткай барацьбы са спэкулянтамі, перакупчыкам. Праводзяцца работы па парадкаваньню і культурнаму абслугоўваньню калгасных базаў.

Зараз абвешчаны двухтыднёвік праверкі гатоўнасьці хлявоў да зімоўкі жывёлы па калгасах, саўгасах і аднаасобным сэктары раёну.

Ударна праводзіцца ўборка бульбы без страт і абмалот убранага ўраджаю, а таксама завяршаецца ўласаваньне кармоў і зяблівага ворыва.

Абвешчана барацьба за добрае захаваньне створаных кармавых і захаваньня створаны кармовых насенных фондаў ўраджаю бульбы.

Зараз праводзіцца праверка гатоўнасьці школ да зімы, калгасьнікі і аднаасобнікі распачалі загатоўкі дроў для школы.

Дэпутацкія групы абавязаны ўсямерна папулярызаваць гэтыя абавязацельствы і прыцягнуць для іх выкананьня шырокія масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў.

А. Кр.

АДКАЗ

нашэ ўранага пленуму Замастоцкага сельсавету, з удзелам старшынь калгасаў і ўсяго савецкага актыву, дэпутатам і сэкцыянэрам Масквы

Дарагія таварышы!

Мы аднадушна ўхваляем Ваш зварот і адказваем Вам радам сацыялістычных самаабавязацельстваў, якія гонарова выканаем да XV гадавіны Пралетарскай дыктатуры.

1. Да 7-га лістапада мы цалкам выканаем плян збожжазагатовак і ўключаемся ў барацьбу—за 70 процантаў лёнавалакна дзяржаве ў гонар ХУ Кастрычніка.

2. Да 15-га кастрычніка мы скончым ўборку бульбы, яшчэ шырэй разгарнуўшы барацьбу са стратамі. Плян бульбазагатовак выканаем да 10-га кастрычніка.

3. Аб'яўляем дэкаду штурму зяблівага ворыва і ўздымем пад зяблева на шу плошчу ў тэрміны, вызначаныя нам.

4. На працягу кастрычніка арганізуем чатыры выезды калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў на калгасны базар з лішкамі нашай прадукцыі.

5. Будзем змагацца за захаваньне нашай калгаснай маёмасьці, чоткра рэвізуючы работу праўленьняў калгасаў.

6. Шырока разгарнуўшы масава-растлумачальную работу, да 1-га студзеня поўнасьцю выплацім запазычанасьць па падпісцы на «4-ты завяршаючы». Даб'емся, каб ўсе лішкі сродкаў калгасаў захоўваліся ў банку. Арганізуем пры сельсавеце касу ашчаднасьці.

7. Да ХУ-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі адрамантуем шлях ад Замасточча да Чырвоных Заборнікаў і шлях на горад Віцебск.

8. Да ХУ гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі адрамантуем школу ў Замасточчы, да 15 лістапада поўнасьцю забясьпечым ўсе школы палам сіламі бацькоў вучняў.

9. Да 1-га сьнежня забясьпечым сем'і закліканых у Чырвоную Армію палам, адрамантуем іх будынкі сіламі калгасьнікаў і членаў вайсковай сэкцыі.

Пленум сельсавету.

102 проц. збожжазагатовак—вось вынік работы дэпутацкіх груп Цяплінскага сельсавету

Пашыраны пленум Цяплінскага сельсавету сумесна з актывам у 90 асоб, прапрацаваўшы зварот дэпутатаў і сэкцыянэраў Масквы, горача адгукнуў ся на яго і ўзяў на сябе рад абавязацельстваў.

Цяплінскі сельсавет на 3 кастрычніка выканаў плян збожжазагатовак на 102 проц. па калгасах і на 90 проц. па аднаасобным сэктары. Загатоўкі праходзілі ў жорсткай барацьбе з вылазкамі клясавага ворага (Кулак Зуєўскі і інш.), якія спрабавалі сарваць правядзеньне загатовак.

Пленум абавязаўся да 7-га лістапада выплаціць усю запазычанасьць па загатоўках збожжа і другіх сельска-гаспадарчых прадуктаў, да 10-га кастрычніка закончыць ўборку бульбы ў адстаючым калгасе «Памяць Леніна», для чаго кожны член сельсавету ўзяў на сябе абавязак: мабілізаваць ня менш 10 капальніц з вёскі і накіраваць іх ў калгас на ўборку бульбы.

Пленум сельсавету даручае дэпутацкай групе калгасу ўзяць шэфства над захаваньнем конскага пагалоўя, устанавіць календарны расклад пляна вага догляду за канём, падшукаць добрых конюхоў.

Пленум абавязваецца згрупаваць масы калгасьнікаў на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, уцягнуць у калгасы бядняцка-серадняцкія масы працоўных аднаасобнікаў; скончыць зяблевае ворыва па калгасах і па аднаасобным сэктары ў тэрміны вызначаныя плянам.

А. Кр.

Чырвоны абоз з мясом (Лёзьнянскі р—н)

Сеньня дапаможны інстытут не пазнаць...

З бурным ростам усяе народнае гаспадаркі палепшаецца і становішча дзетустаноў.

Дзетустановы гораду Віцебску разгарнулі работу па ажыцьцяўленьні пастановы ЦК і дамагліся значных посьпехаў.

Мы застановімся на аднэй з дзетустаноў г. Віцебску, якая у перабудове сваёй работы мае значныя вынікі.

У пачатку 1931-32 навучальнага году ў дапаможным інстытуце быў бруд, адсутнічала дысцыпліна сярод дзяцей, быў кволы склад пэдагагічнавыхавачага пэрсаналу, вялізарнейшая безгаспадарчасьць. Дзеці хадзілі абадраныя. Настаўнікі несвячасова зьяўляліся на заняткі.

Сёньня гэты інстытут не пазнаць. Дзеці чыстыя, усе займаюцца ў школе, самастойна выконваюць заданьні па школе ва ўне школьныя гадзіны. Гэта дзеці—псыхічна-хворыя, так званыя разумова-адсталыя (алігафрэны), якія ў мінулым годзе білі шкло ня толькі ў інстытуце, але і ў суседзей, разграмілі ў Левінсова агарод, за што па суду інстытут уплаціў 40 руб., а зараз інстытут мае свой агарод, з якога да познай восені хопіць сваёй гародніны для ежы дзецям і спэцыяльнай гародніны для 3-х вялізарных породзістых сьвіней.

Гэта псыхічна-хворыя дзеці, якія у мінулым годзе лазілі па чужым садам, сёлета самі даглядалі свой агарод, да яшчэ дапамагалі ўсё лета каапгасу «Чырвоная Армія».

Трудавыя працэсы прывілі дзецям любоў да працы і дысцыплінаванасьць. Калі ў мінулую зіму дзеці з клясавых заняткаў праз фортачку уцякалі, дык у гэтым годзе мы бачым іх пры самастойных заняткох без выхавацелей. Усе дзеці ахоплены пінэрацай, рытмікай, школай, па-за школьнай працай і працай у вытворчых майстэрнях, якіх у інстытуце тры (павецкая, кравецкая, сталярная).

Зараз мы маем 14 пінэраў. Гэта здаровае зьявіна, якое удзельнічае ў самакіраваньні дзяцей.

У дысцыпліне, вытворчым навучаньні адыгрывае вялікую ролю дзіцячая насьценгазэта. Усе дзеці ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам як на вучобе, гэтак па вытворчаму навучаньню.

Па штату інстытут разлічан на 80 асоб, але зараз даслалі дзяцей з гарадоў БССР—70 (гэты інстытут рэспубліканскі).

Значную ролю ў перабудове працы адыгралі шэфы інстытуту—пэдагагічна-індустр. інстытут і таварыства «прыхільнік дзяцей», у прыватнасьці тав. НІКАЛАЕЎ і т. ШОК.

Пэдінстытут меў сталую сувязь з дапаможным інстытутам. Лектарскі склад пэдагагічнага інстытуту даваў вялізарную дапамогу ў напрамку кансультацыі. Працаўнікі дапаможнага інстытуту ў сваю чаргу дапамагалі настаўнікам дапаможных школ гораду і дзетдамам у іх працы па школе.

Асабліва тав. Мышка шмат удзяліў увагі дапаможнаму інстытуту.

У выніку шэфства, дапаможны інстытут арганізаваў габінэт настаўніка з грунтоўнай бібліятэкай, пэдалёгічны габінэт, легапэдычны. Атрымаў ад пэдагагічнага інстытуту 2 настаўнікаў з вышэйшай асьветай. Арганізавана група з 6 асоб, якія завочна навучаюцца на пэдалёгічным адзяленьні Маскоўскага інстытуту.

Таварыства «Прыхільнік Дзяцей» стала трымала сувязь з інстытутам, дало сродкі на рамонт памяшканьня, пабудавала пограб, дала матор для прывядзеньня у рух варштатаў сталярнай майстэрні, якая мэханізавана.

Інстытут утрымоўваецца на сродкі дзяржавы. Дзякуючы гэтаму мясцовыя арганізацыі да інстытуту адносяцца, як да ўстановы, падпарадкаванай цэнтру. Асабліва гэта назіраецца з боку гарсавету, якія заўсёды адмаўляе у дапамозе (нават па рамонту сараю, абутковай майстэрні). Амаль ніякай дапамогі інстытут ня мае і з боку КСМ.

На працягу двух год НКА не забясьпечыў інстытут праграмамі.

Інстытут працуе па праграмах, якія працаваны яго калектывам.

Зараз разгортваецца навукова-дасьледчая работа па адшуканьні лепшых шляхоў марксыцка-ленінскага выхаваньня разумова адсталых дзяцей.

XV-ю гадавіну Кастрычніка мы сустрэнем новымі перамогамі ў барацьбе за ажыцьцяўленьне пастановы ЦК.

В. Крыжоў.

Дубовыя жалуды—сыравіна для сьпірытусовай прамысловасьці

Сьпірытусовая прамысловасьць за апошнія гады дасягнула значных посьпехаў. Але разам з посьпехамі на асобных вучастках маецца шмат неладнасьцей і прарываў. Сьпірытусовая прамысловасьць за апошнія гады ня выконвае сваёй вытворчай праграмы з прычыны адсутнасьці дастатковай колькасьці сыравіны. Матар'ялы Наркамснабу б'юць трывогу аб тым, што пры пляне па выпуску сьпірытусу ў гэтым годзе ня будзе выкананы. Пад пагрозу ставіцца снабжэньне сьпіртавай (сьпірытусам) заводаў сынтэтычнага (штучнага) каучука.

Краіна ня можа мірыцца з такім становішчам. Трэба знайсьці і тэхналёгічна аўладаць новымі нехарчавымі відамі сыравіны для сьпірытусовай індустрыі, якіх-б павялічылі рэсурсы і дапамаглі-б выканаць праграму сьпірытусовай прамысловасьці. Што можна ў СССР скарыстаць, як сыравіну для выкуркі сьпірытусу?

Наяўнасьць дубовых масываў ў СССР дае магчымасьць скарыстаць для гэтае мэты жолуд.

Што становіць сабой жолуд як сыравіна? Як вядома сьпірытус атрымоўваецца з крухмалу. У БССР тэхнічная бульба мае 18—20 проц. крахмалу, а жолуд, дасьледваны ў лябораторыі НДІ харчовай прамысловасьці мае крухмалістасьці да 40 проц., г. зн. кілёграм жолудаў мае крухмалу ў 2 разы болей, чым кілёграм бульбы. Тэхналогія з адзнай вагавай адзінкі жолудаў можна атрымаць у 2 разы болей сьпірытусу, чым з вагавай адзінкі бульбы.

Жолудам, як сыравінаю для выкуркі сьпірытусу, цікавіліся даўно. Пасобныя вінакуры ня раз прабавалі курыць сьпірытус з жолуда, але з прычыны адсутнасьці дасканалай схэмы вытворчасьці атрымоўвалі малыя выхады. Навукова-дасьледчыя інстытуты ня прынялі ім на дапамогу.

Беларускі навукова-дасьледчы інстытут харчовай прамысловасьці з першых дзён сваёй работы ўключыў ў тэматычнае вытворчасьці сьпірытусу з жолудаў. Ён паставіў мэту ў найкарацейшы тэрмін аўладаць тэхналёгічнай схэмай вытворчасьці, дабіцца высокіх выхадаў, перадаўшы дасягненьні прамысловасьці.

Наколькі эканамічна мэтазгодней перапрацоўваць жолуды на сьпірытус ў параўнаньні з бульбай?

У БССР, паводле зьвестак Лесбелу, у мінулым годзе загатоўчая цана на жолуды была 5 руб. цнт. супроць 3р. жолудаў мае крухмалу ў 2 разы больш, чым цнт. бульбы, дык за жолудамі застаецца перавага на 2 р. 20 к. з 1 цнт.

Выходзячы з нарыхтоўчай цаны мінулага і гэтага гадоў на бульбу і жолуды, можна з упэўненасьцю канстатаваць поўную эканамічную мэтазгоднасьць уключэньня жолудаў у сыравіну для сьпірытусовай прамысловасьці.

Ці ёсьць у нас адпаведная база для наладжаваньня выкуркі сьпірытусу з жолудаў? Ёсьць. Па зьвестках Лесбелу БССР мае пад дубовымі лясамі 124010 га, з якіх дзяржаўнага значэньня—119949 і мясцовага—4064 га. Лясы разьмешчаны ў 58 раёнах. У сярэднім на адміністрацыйны раён прыпадае 2138 га. Калі разьбіць раёны на групы па разьмерах плошчаў пад дубам, дык атрымаем:

Лік раёнаў з плошчай пад дубам да 500 га-30
" " " ад 500 да 2000 га—7
" " " больш 4000—12

Як відаць найбольшую групу складаюць раёны з плошчай да 500 га.

Раёны першай групы знаходзяцца пераважна ў паўночнай частцы БССР. Раёны другой групы—у заходняй і ўсходняй частках БССР. Раёны трэцяй групы—у сярэдня-паўднёвай частцы БССР. Апошняя група, пачынаючы з Клічаўскага раёну, праходзіць праз Бабруйскі, Парыцкі раёны і ахапляе амаль усю паўднёвую частку БССР

Геаграфічнае разьмяшчэньне дубавых масываў па раёнах якраз супадае з геаграфічным разьмяшчэньнем сьпірытусавай прамысловасьці.

Арыентыравана падлічым, на якія рэсурсы жолудаў можа разьлічваць сьпірытусовая прамысловасьць БССР. Па зьвестках Лесбелу з 1 га дубовых лясоў можна сабраць у сярэднім 10 цнт. жолудаў, а ва ўраджайныя гады значна болей. Пры сярэднім ўраджаі, пры добрай арганізацыі збору можна атрымаць 10×124.000=1.240.000 цнт. Паколькі 1 цнт жолудаў дае ў 2 разы болей крахмалу, чым бульба, знаходзім, што з сабраных жолудаў можна атрымаць 124000000 кгр.=6200000 вядзёр сьпірытусу ў 40°, што складае 73 проц. 20 кгр. праграмы 1932 году.

Такім чынам бачым, што дастатковая база ёсьць. Што неабходна арганізаваць, каб атрымаць адпаведную колькасьць жолудаў для сьпірытусавай прамысловасьці на 1932 г.?

Перш за ўсё неабходна сьпірытусавай прамысловасьці прапрацаваць пытаньне арганізацыі збору жолудаў, за гадзя дагаварыўшыся з Лесбелам. Трэба вылучыць, завод, дзе можна было-б наладзіць выраб сьпірытусу і весьці папрыхтоўчую работу.

НДІ харчовай прамысловасьці трэба паскорыць работу па выкурцы сьпірытусу з жолудаў і свячасова перадаць яго прамысловасьці.

Час абмежзваны. Будзем гатовы ў гэтым годзе да максымальнага выкарыстоўваньня жолудаў, як другарадную сыравіну для сьпірытусовай прамысловасьці.

Ярмашэвіч.

Адгрузка бульбы пад пагрозай зрыву

Адгрузка бульбы па Магілеўскім раёне пачнецца на самацёк. Калгасьнікі, аднаасобнікі-бяднякі і сераднякі не мабілізаваны на свячасовае выкананьне пляну. У выніку гэтага адгрузка бульбы зрываецца.

На сёньнішні дзень раёна адгрузіла ўсяго 82 тоны бульбы (41% пляну), райплодагародніна—119 тон (па пляну 650). Акрамя гэтага райплодагародніна павінна адгрузіць васьмідзесяць 3.000 тон бульбы, з якіх яшчэ не адгружана ніводнай тоны.

Г. Модзі

Убіраюць бульбу (к—с «Новы Шлях» Лечынскі р—н).

Больш і лепшай якасьці тавараў шырспажыву на калгасныя рынкі

Бурны рост сацыялістычнага будаўніцтва, палепшаньне матар'яльнага становішча шырокіх рабочых мас, калгасьнікаў і працоўных сялян-аднаасобнікаў, вялізарны ўздым культуры нага ўзроўню ўсяго працоўнага насельніцтва Савецкага Саюзу з кожным днём патрабуе ад прамысловасьці ўсё большага і большага выробу тавараў шырокага спажываньня.

У пастановах Ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, 3-й сэсіі ЦВК БССР даны чоткія дырэктывы прамысловасьці БССР, па дадатковым выробе тавараў шырокага спажываньня ў другім паўгодзьдзі 4-га завяршаючага году першай пяцігодкі.

Прамысловасьць БССР на працягу другога паўгодзьдзя павінна выраблі прадукцыі шырокага спажываньня на суму 30.605 тыс. руб.

Па лёгкай прамысловасьці заданьне вызначана на суму 9.400 тыс. руб., прамкаапэрацыі — 14,223 тыс. руб., цяжкай прамысловасьці — 2.540 тыс. руб., лясной — 1,28½ тыс. руб., мясцовай — 1,512 тыс. руб., НКснабу—462 тыс. руб., інвалідзкай каапэрацыі—799,8 тыс. руб. і іншых гаспадарчых арганізацыях—540 тыс. руб.

Пастановы партыі і ўраду абавязваюць усіх гаспадарнікаў, партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі ўжыць рашучыя захады, да пашырэньня выробу тавараў шырокага спажываньня, шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, рацыянальнага скарыстаньня і ўтылізацыі ўсіх адыходаў вытворчасьці.

Задача, пастаўленая перад нашай прамысловасьцю і асабліва перад лёгкай, аб выробе тавараў шырокага спажываньня вызначаецца вялізарнымі посьпехамі нашай цяжкай індустрыі. Зараз, калі ўжо адноўлена і пабудавана цяжкая індустрыя і падводзіцца магутная тэхнічная база пад сельскую гаспадарку, гэтым самым ствараецца моцная аснова тэхнічнага пераўзбраеньня лёгкай прамысловасьці. Лёгкая прамысловасьць павінна адыграць рашаючую ролю ў справе выробу тавараў шырокага спажываньня хутчэйшага прасоўваньня іх да спажыўца, да найхутчэйшага пашырэньня савецкага гандлю.

Яшчэ на ХУ1 зьезьдзе партыі аб рабоце нашай прамысловасьці т. Сталін зусім чотка сказаў: «Дагэтуль мы эканомілі на ўсім, у тым ліку і на лёгкай індустрыі, для таго, каб аднавіць цяжкую індустрыю. Але цяжкую індустрыю мы ўжо аднавілі. Яе трэба толькі разгарнуць далей. Цяпер мы можам павярнуцца да лёгкай індустрыі і рушыць яе наперад паскораным тэмпам. Новае ў разьвіцьці нашае прамысловасьці заключаецца ў тым, што мы маем цяпер магчымасьць разьвіваць паскораным тэмпам і лёгкую індустрыю».

Гэтыя дырэктывы правадыра партыі па бальшавіцку ажыцьцяўляюцца. У няпрымірымай барацьбе з правымі і левымі апартуністамі, ідучы па шляху ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў т. СТАЛІНА, БССР дасягнула вялікага зруху ў разьвіцьці лёгкай прамысловасьці.

Працоўны сьпіс лёгкай прамысловасьці БССР узбагаціўся новымі прадпрыемствамі. У строй уступілі новыя волаты лёгкае індустрыі — Віцебская Швэйная ф-ка «Сьцяг Індустрыялізацыі», Віцебская панчошная ф-ка «КІМ», Гомельскі маргарынавы завод і інш.

На працягу 1932 году лёгкая прамысловасьць БССР павінна даць краіне валавой прадукцыі на 406.8 млн. руб. У 1-м паўгодзьдзі г. г. лёгкая прамысловасьць БССР, праз каапэрацыйную сыстэму дала рабочым калгасьнікам, бедняком і серадняком-аднаасобнікам на сотні мільёнаў рублёў гатовай вопраткі, абутку, бялізны, панчох хаў, і цэлы рад іншых рэчаў першай патрэбы.

НКЛП БССР даны ўсім аб'яднаньням і трэстам пляны па дадатковым павялічэньні выробу тавараў шырокага спажываньня па рэспубліканскай лёгкай прамысловасьці на II-е паўгодзьдзе 32 г. за лік дадатковага выробу прадукцыі, зьмены асартымэнту, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, арганізацыі ўтыльцэхаў і пазапляновай дадатковай сыравіны на суму 9,493 тыс. руб.

Па асобных галінах лёгкай прамысловасьці дадатковы выраб прадукцыі шырокага спажываньня характарызуецца наступнымі лічбамі:

Швэйная прамысловасьць да канца 1932 г. павінна вырабіць дадатковае прадукцыі шырокага спажываньня на суму 3.423 тыс. руб. У III-м квартале швэйная прамысловасьць БССР дала рынку дадатковае прадукцыі шырокага спажываньня наступныя асар тымэнты: мужчынскае бялізны 25 тыс. камплектаў, жаночых сукенак бавўняна - папяровых — 25 тыс., штаноў-галіфэ — 25 тыс., плашчоў брызэнтавых — 16 тыс., футровых жаночых паліто—500, паўпаліто—500 і розных дробных рэчаў шырокага спажываньня на суму 400 тыс. руб.

Шкляная прамысловасьць за лік зьмены асартымэнту павінна вырабіць на працягу II-га паўгодзьдзя прадукцыі шырокага спажываньня на суму 563 тыс. руб. Асартымэнт на вышэйпамянёную суму прадметаў шырокага спажываньня па шкляной прамысловасьці зацьверджан: шклянак — 3.700 тыс. штук, манерак на варэньне—27 тыс. штук, збаноў на малако — 120 тыс. штук, гаспадарчых бутляў — 60 тыс. штук і рад дробных рэчаў.

Скурана - абутковая прамысловасьць на працягу II-га паўгодзьдзя павінна вырабіць тавараў шырокага спажываньня на суму 1.994 тыс. руб. Скурана - абутковая прамысловасьць на працягу III-га кварталу выпрабіла на рынак 14.500 пар дзіцячага абутку, 7,146 пар балетак, 2.250 пар сандаляў, 3,600 пар загатовак, хаму тоў—400 штук, шлей 780, абароцяй, — 750 штук, падсядзёлкаў — 1.000 штук, кажухоў—357, шапак—368, рукавіц—516 пар і апрача гэтага шмат скурана - галянтарэйных рэчаў.

Тэкстыльная прамысловасьць за II-е паўгодзьдзе павінна даць дадатковай прадукцыі шырокага спажываньня на суму 1.693 тыс. руб., з якіх толькі трыкатажных вырабаў на суму 1,221 тыс. руб.

Хімічная прамысловасьць за II-е паўгодзьдзе павінна вырабіць прадукцыі шырокага спажываньня на суму 1.101 тыс. руб.

Запалкавая прамысловасьць за II-е паўгодзьдзе павінна вырабіць прадукцыі шырокага спажываньня на суму 1.101 тыс. руб.

Паліграфічная прамысловасьць за кошт скарыстаньня адыходаў і зьмены асартымэнту ў II-м паўгодзьдзі павінна вырабіць дадатковае прадукцыі шырокага спажываньня на 233 тыс. руб.

Трэба сказаць, што большасьць прадукцыі, якая вырабляецца дадаткова, будзе вырабляцца за кошт мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, шляхам рацыянальнага скарыстаньня адыходаў вытворчасьці. Напрыклад, на Менскай скур-галянтарэйнай ф-цы «УСХОД» з адыходаў, якія раней ішлі на звалку, цяпер робяць ручныя кошыкі, пляцёныя паясы і іншыя рэчы.

Калегія НКПЛБ арганізавала брыгады з адказных працаўнікоў і лепшых ІТР, якія пасылаюцца на прадпрыемствы для дапамогі ў правядзеньні адпаведнай работы па наладжаваньню выробу дадатковай прадукцыі шырокага спажываньня.

Лёгкая прамысловасьць БССР, якая атрымлівае вялікую тэхнічную базу ад цяжкай індустрыі, якая мае кадры навучаных і высока-кваліфікаваных рабочых, ўжываючы сацыялістычныя мэтады працы — сацспабор ніцтва і ўдарніцтва, паклаўшы ў аснову сваёй работы ва ўсіх зьвеньнях прамысловасьці 6 гістарычных умоў тав. СТАЛІНА, можа і павінна па-бальшавіцку выканаць свае заданьні, даць калгаснаму базару высокаякасную прадукцыю шырокага спажываньня.

Галоўную ролю ў справе выробу прадукцыі шырокага спажываньня адыгрывае лёгкая прамысловасьць. Аднак вялікую колькасьць прадметаў шырокага спажываньня вырабляе і цяжкая прамысловасьць БССР. Мэталяапрацоўчыя заводы, якія падпарадкаваны Бэмэтальаб'яднаньню, на працягу II-га паўгодзьдзя даюць дадатковай прадукцыі шырокага спажываньня выключна з адыходаў на суму 1.234 тыс. руб. Асартымэнт тавараў шырокага спажываньня, які вырабляецца з адыходаў мэталу мэталяапрацоўчай прамысловасьці БССР, даволі вялікія. Да канца II-га паўгодзьдзя мэталя - апрацоўчая прамысловасьць павінна даць калгаснаму рынку:

Бабак для клёпкі кос—19.200 штук.
Малаткоў—22.000 шт.
Грабляў жалезных—3.000 шт.
Сякер цясьлярскіх—7.400 шт.
Вёдзер ацынкованых—120.000 шт.
Капаліц агародных—3.800 шт.
Вілак пячных—6.050 шт.
Качэргаў—4.400 шт.
Жаровень—5.000 шт.
Скаварод—12.000 шт.
Ночваў ацынкованых—17.000 шт.
Замкоў вісучых—10.000 шт.
Замкоў унутраных—20.000 ш

Шырокім разгортваньнем сацспаборніцтва

забясьпечым высокаякасную падрыхтоўку спэцыялістаў

Выклік маскоўскіх ВНУ прыняты

Агульна - гарадзкі сход навуковых працаўнікоў гор. Менску, прысьвечаны пастанове ЦВК СССР аб праграмах і рэжыме ў вышэйшай школе і тэхнікумаў прайшоў з надзвычайным уздымам. Выступайшыя ў спрэчках па дакладу тав. Рыўліна навуковыя працаўнікі віталі гэту гістарычную пастанову ўраду і расцэньвалі яе, як разгорнутую бальшавіцкую праграму барацьбы за падвышэньне якасьці працы вышэйшых школ ў мэтах далейшага палепшаньня падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў спэцыялістаў для ўсіх галін нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

— Гістарычная пастанова ЦВК, гаворыцца ў адзінадушна прынятай сходам рэзалюцыі, ставіць перад вышэйшай школай, якая мае буйнейшыя дасягненьні як па ўсім Саюзе, так і ў БССР, — задачу — зьнішчыць тыя скажэньні, што былі дапушчаны Наркаматамі і паасобнымі ВНУ і ВТНУ ў правядзеньні лініі партыі ў галіне будаўніцтва вышэйшай школы.

— Гэта пастанова павінна забясьпечыць далейшыя буйныя перамогі і поўную рэалізацыю неаднаразовых дырэктыў партыі аб рашучым падвышэньні якасьці падрыхтоўкі спэцыялістаў.

Сход навуковых працаўнікоў Менску пастанавіў распрацаваць пастанову ЦВК аб ўсіх ВНУ, ВТНУ і паасобных катэдрах пад пунктам погляду рэалізацыі гэтай пастановы, выходзячы з канкрэтных умоў кожнай вышэйшай навучальнай установы і катэдры.

Сход эварочвае асаблівую ўвагу ўсіх навуковых працаўнікоў на неабходнасьці пры вызначэньні мэтадаў навучаньня падыходзіць канкрэтна з улікам асаблівасьці вучэбнага матар'ялу і кожнай дысцыпліны, з улікам кваліфікацыі выкладчыкаў, а таксама ўзроўню падрыхтоўкі студэнцтва, на якім вучэбнага абсталяваньня, лябараторый і г. д. Трэба праводзіць рашучую барацьбу з імкненьнямі навязаць які-б там ні было адзіны ўніверсальны мэтад выкладаньня.

Адзначаючы, што мясцовыя бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў дагэтуль па-сапраўднаму яшчэ не паварушыліся тварам да вытворчасьці. Сход прапанаваў Менскаму гарадзкому бюро СНП распрацаваць мерапрыемствы для ўзмацненьня работы мясцовых бюро, якія павінны стаць застрэльшчыкамі ў барацьбе за падвышэньне якасьці працы вышэйшай школы.

Сходам прынята яшчэ рад практычных пастаноў, накіраваных на лепшае ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦВК Саюзу СССР.

У адказ на адозву навуковых працаўнікоў і студэнцтва Маскоўскага Энэргетычнага інстытуту імя МОЛАТАВА і машынна - будаўнічага інстытуту імя БАУМАНА агульна-гарадзкі сход заклікае навуковых працаўнікоў і студэнцтва гор. Менску ўключыцца ў правядзеньне ўсесаюзнага сацспаборніцтва ВНУ і ВТНУ на лепшае ажыцьцяўленьне пастановы ЦВК Саюзу СССР.

Адказваюць пашырэньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Пастанова ЦВК Саюзу ССР аб праграмах і рэжыме вышэйшай школы і тэхнікумаў сустрэнута з надзвычайным пад'ёмам навуковымі працаўнікамі і студэнтвам ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў Менску.

Гэтымі днямі адбыўся сход прафэсарска-выкладчыцкага пэрсаналу і студэнцтва Плянава - эканамічнага камбінату, у склад якога ўваходзяць інстытут, рабфак і тэхнікум.

На сходзе выступіў старшыня Дзяржпляну БССР тав. Шапіра, які адзначыў значэньне і ролю кваліфікаванага эканаміста - плянавіка ў сацыялістычнага будаўніцтва і зьвярнуўся з заклікам да навуковых працаўнікоў і студэнцтва - мабілізавацца на пасьпяховую рэалізацыю пастановы ЦВК СССР аб праграмах і рэжыме ў вышэйшай школе і тэхнікумах.

Гэты заклік быў падхоплен з энтузіязмам. Цэлы рад навуковых працаўнікоў на сходзе абвясьцілі сябе ўдарнікамі і ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па лепшай рэалізацыі пастановы ўраду. Студэнты сельскагаспадарчага аддзяленьня абвясьцілі сябе ўдарнікамі па ліквідацыі прарываў у галіне працдысцыпліны і абавязаліся па-бальшавіцку змагацца за падвышэньне якасьці вучобы.

Сходам прынята пастанова, якой вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы і ўзята рад абавязацельстваў, накіраваных на лепшае ажыцьцяўленьне пастановы ЦВК СССР.

П.

Вышэйшы пэдагагічны інстытут--на шляхох рашучае перабудовы

Гэтымі днямі ў прыродазнаўчым корпусе Унівэрсытэцкага гарадка адбыўся агульны сход студэнтаў усіх трох факультэтаў Вышэйшага пэдінстытуту, прысьвечаны гістарычнай пастанове ЦВК Саюзу ССР аб праграмах і рэжыме ў вышэйшай школе і тэхнікумах.

З дакладам аб задачах вышэйшай школы ў сувязі з пастановай ураду выступіў тав. Рыўлін.

Дакладчык перш за ўсё спыніўся на вялізарных дасягненьнях Савецкага Саюзу. і ў прыватнасьці БССР у галіне будаўніцтва вышэйшай школы. Даволі сказаць, што кантынгент студэнцтваў—у ВНУ і ВТНУ БССР за апошнія два з паловай гады павялічыўся з 4.000 да 16.000 чал., а ліквідаваны самых вышэйшых навучальных устаноў з 3—4 да 30. Гэтыя буйнейшыя колькасныя зрухі ў нашай вышэйшай школе, зразумела, шчыльна зьвязаны з агульным ростам сацыялістычнага будаўніцтва. Пэўныя дасягненьні ёсьць у нас і па лініі якаснага росту ВНУ.

— Але трэба зазначыць,—гаворыць тав. Рыўлін,—што якасны бок вучобы прымушаў і прымушае жадаць яшчэ значна і значна лепшага. Нашы ВНУ яшчэ не забясьпечвалі спэцыяліста агульна тэорэтычнымі ведамі, агульнай асьветай у належным аб'ёме. XVII канфэрэнцыя УсеКП(б) асабліва падкрэсьлівае ў сваіх рашэньнях необходнасьць падрыхтоўкі кадраў з дастаткова высокай кваліфікацыяй. Некаторыя-ж нашы Наркаматы, а таксама ВНУ і ВТНУ, не надалі гэтай справе адпаведнай увагі і значэньня.

Мы мелі недапушчальны падзел ВНУ на безьлік дробных спэцыяльнасьцяй. Напрыклад. Менскі каапэратыўны інстытут рыхтаваў людзей 26 спэцыяльнасьцяй.

Па-рэсьліваючы сваячасовасьць і вялізарнае значэньне пастановы ЦВК СССР, тав. Рыўлін гаворыць аб наяўнасьці шкодных думак і настрояў, якія назіраюцца сярод асобных навуковых працаўнікоў пасьля апублікаваньня гэтай пастановы. Ёсьць думкі, паводле якіх пастанова расцэньваецца, як «крок назад», як адступленьне на пазыцыю старое, схалястычнае школы.

Трэба цьвёрда ўцяміць і зразумець, што пастанова ЦВК аб рэжыме ў вышэйшай школе ні ў якім разе не зьяўляецца крокам назад да старое школы, што нашы ВНУ ня маюць нічога супольнага са старой школай, што пастанова выклікана менавіта задачамі нашага росту і мае на мэце вывключна падвышэньне якасьці спэцыялістаў, якіх яна выпускае.

Задача адміністрацыі ВПІ, партыйных, прафэсыянальных і камсамольскіх арганізацый студэнцтва, прафэсарска-выкладчыцкага пэрсаналу—правільна ажыцьцявіць рашэньні ЦВК Саюзу і як мага хутчэй дабіцца на іх аснове радыкальных перамог.

Выступўшыя ў спрэчках т. т. Кобля, Нісэнбаўм, Камісарчык, Мельнік і інш. аднадушна падкрэсьлілі сваячасовасьць і правільнасьць пастановы ўраду СССР у адносінах ВНУ і прыводзілі факты хваравітых зьявішч, якія маюць месца ў навучаньні да апошняга часу на іх факультэтах

Намесьнік дырэктара ВПІ тав. Рад чэўскі паведаміў аб мерапрыемствах, якія разгортваюцца зараз у вышэйшым пэдінстытуце ў зьвязку з пастановай ЦВК. Да ліку іх адносяцца: па вялічэньне тэрміну навучаньня амаль на ўсіх аддзяленьнях да 3 з паловай і 4 год, перагляд навучальных плянаў і праграм, перабудова вытворчае практыкі студэнтаў (на практыку адпускаецца 30 проц. часу, пры чым яна шчыльна дапасоўваецца да задач адпаведнай спэцыяльнасьці), увядзеньне дыфэрэнцыраванай стыпэндыі паводле пасьпяховасьці студэнцтва.

Сходам прыняты пастановы, накіраваныя на лепшую рэалізацыю дырэктывы ўраду Саюзу ССР.

Юр. Л—ны.

Па-баявому рыхтавацца да Кастрычніцкай гадавіны

Набліжаецца XV гадавіна Кастрычніка. Рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу рыхтуюцца сустрэць XV-цігодзьдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі новымі посьпехамі і перамогамі. У сьвяце агульнага сусьветнага крызісу, беспрацоўя і галечы працоўных мас капіталістычных краін асабліва ярка выяўляюцца заваёвы вялікага Кастрычніка і вялікія посьпехі на франтох гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, якія мы маем ў СССР.

Пралетарская рэвалюцыя абудзіла нябачныя творчыя сілы з-пад прыгнечаньня капіталу і памешчыкаў. Мільёны працоўных пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вядуць гіганцкую і ўпартую барацьбу за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

XV гадавіна супадае са сканчэньнем у чатыры гады першай пяцігодкі. Пасьпяховае выкананьне народна-гаспадарчага пляну бягучага завяршаючага году пяцігодкі зьяўляецца галоўнай ўмовай, якая забясьпечвае нам непасрэдны подступ да другой пяцігодкі—да пяцігодкі пабудовы сацыялістычнага грамадзтва.

Падрыхтоўка да Кастрычніцкай гадавіны павінна праводзіцца пад лёзунгам пасьпяховага выкананьня прамфінпляну ў прамысловасьці, павялічэньня вырабу мэталю, вугалю і асабліва прадметаў шырокага спажываньня, што ідуць на гарадзкі і вясковы рынак. У вёсцы падрыхтоўка да Кастрычніцкіх дзён павінна праходзіць пад лёзунгам: поўнае—выкананьне пляну асеньняе сяўбы і зяблівага ворыва, рашучая барацьба за высокі ўраджай і арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, поўнае выкананьне плянаў збожжазагатовак і разгортваньне калгаснага гандлю.

Галоўнай задачай вёскі, якая вызначае сабой і посьпехі ў галіне арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў, зьяўляецца барацьба за ўстойлівае земляробства ў калгасах і саўгасах, за правільныя севазвароты. Высокі ўраджай на аснове шырокага ўкараненьня агратэхнікі, высокая прадукцыйнасьць жывёлагадоўлі ўзьнімуць прыбытковасьць і таварнасьць сельскай гаспадаркі і хутка забясьпечаць агульнае палепшаньне снабжэньня гораду і вёскі сельгаспсыравінай і прадуктамі харчаваньня. Пастанова ЦВК і СНК СССР аб устойлівым землякарыстаньні калгасаў павінна быць шырока растлумачана. Гэтая пастанова, паставіўшыя рубам пытаньне аб якасным уздыме сацыялістычнага земляробства, зьяўляецца выразам вялізарных заваёў на шляху рэвалюцыі, іменна таго факту, што наша краіна канчаткова замацавалася на сацыялістычным шляху разьвіцьця.

Мы ўзмацняем і разьвіваем сацыялістычную грамадзкую ўласнасьць. Але мы павінны і ахоўваць яе. Ахова сьвяшчэннай сацыялістычнай уласнасьці ёсьць справа ўсіх калгасных мас, і вакол гэтай задачы мы павінны разгарнуць шырокую масавую і растлумачальную работу.

Масавая работа па падрыхтоўцы да XV-цігодзьдзя Кастрычніка павінна быць увязана з чарговымі задачамі, больш таго, яе необходна падпарадкаваць выкананьню асноўных гаспадарча-палітычных задач на вёсцы. Патрэбна, каб кожны калгас, саўгас і МТС, кожны сельсавет і ячэйка партыі і камсамолу да Кастрычніцкай гадавіны дабіліся рашаючых посьпехаў у выкананьні чарговых гаспадарча-палітычных кампаній.

Рабочыя буйнейшых прадпрыемстваў Ленінграду ў сваім звароце да ўсіх працоўных Савецкага саюзу ў сувязі з XV-цігодзьдзем Кастрычніка пісалі:

«Напярэдадні слаўнай гадавіны Кастрычніка мы заклікаем усіх працоўных Савецкага саюзу да новага ўзьлёту ініцыятывы і творчай работы, да рашучай барацьбы за перамаганьне цяжкасьцяй, за выкананьне прамфінпляну.

На мясцох трэба разгарнуць шырокую праверку вынікаў сацспаборніцтва і ўдарніцтва, уцягненьня новых мас у склад ўдарнікаў, праверку практычнай рэалізацыі асноўных раэнэньняў і дырэктаў нашай партыі і ўраду.

Падрыхтоўку да Кастрычніка неабходна праводзіць па ўсім зьвеньням. Ініцыятарамі і кіраўнікамі ўсіх падрыхтоўчых работ павінны быць партыйныя і камсамольскія ячэйкі. Ва ўсіх ячэйках, саветах, калгасах і прафарганізацыях неабходна вызначыць спэцыяльных таварышоў, якія прапрацавалі-б пляны правядзеньня гадавіны. Для аб'яднаньня ўсёй работы належыць стварыць сельскія раённыя камісіі. Ва ўсю работу павінны быць шырока ўцягнуты ўсе палітыка-асьветныя ўстановы, насьценгазэты. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на правядзеньне агульных калгасных і сельскіх сходаў, гутарак, прысьвечаных надыходзячай гадавіне. У хатах-чытальнях, чырвоных куткох саўгасаў неабходна арганізаваць выстаўкі плякатаў і дыяграм з показам усіх нашых дасягненьняў, падабраць адпаведную літаратуру, арганізаваўшы яе чытку. Адным словам, неабходна прывесьці ў рух усе формы масавай работы, каб не засталося ні одднага калгасьніка, ніводнага аднаасобніка, ніводнай сялянкі і калгасьніцы, ніводнага школьніка, якія-б былі няахоплены гэтай работай XV гадавіны—гэта сёрата міжнароднага пралетарыяту. Мы ідзем да гэтага юбілею з вялікімі дасягненьнямі, але і з нямалымі цяжкасьцямі. Усялякія цяжкасьці партыя перамагала і перамагае, абапіраючыся на масы, з дапамогаю мас, і галоўная задача ў даны момант—аб гэтым павінен разумець кожны камуніст на сяле—уцягнуць дзесяткі, сотні тысяч мас у актыўнае сацыялістычнае будаўніцтва.

Рэлігія--зброя клясавага ворага

Яўрэйскія рэлігійныя сьвяты, як і сьвяты іншых рэлігій, зьяўляюцца ароддкам апітацыі сярод працоўных мас за ўзмацненьне рэлігіі і навязваньня працоўным эксплёататарскай ідэалёгіі.

Служкі рэлігійных культаў усіх масьцей—папы, раўвіны, ксяндзы, мулы, сэктанскія прапаведнікі—імкнуцца рас падпоўзваць у масах рэлігійны сьвятапогляд, дробна-ўласьніцкія настрої, індывідуалізм і варожыя адносіны да калектывізму. Духоўнікі пры дапамозе рэлігійнага дурману імкнуцца зьвяжыць клясавую сьвядомасьць працоўных. Яны прапаведваюць братэтва з кулаком.

На даным этапе сацбудаўніцтва, ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, рэлігія зьяўляецца тэй зброяй кляса савага ворага, пры дапамозе якой ён выступае супроць усіх мерапрыемстваў партыі і савецкай улады.

Яшчэ ніколі становішча пралетарыяту і працоўных у капіталістычных краінах ня было такім дыкім, як зараз, у час жорсткага эканамічнага крызісу, які перажывае капітал.

Тут на службу капіталу прыхоп'ілі рэлігію. Духоўнікі, гэтыя цэрбэры капіталізму, імкнуцца ўтрымаць працоўным, што весь цяжар жыцьця зьвязаны з эксплёататарскім ладам, зьяўляецца нічым іншым, як пакараньнем за грахі людзей. Папа Пій XI у адным з сваіх апошніх пасланьняў кажа, што рабочыя ў час крызісу павінны маліцца богу і за гэта яны атрымаюць нябеснае царства.

Папа заклікае усіх капіталістаў аб'яднацца для барацьбы з камунізмам, з рэвалюцыйным рухам, супроць СССР. Ён працягвае руку равінам, папам, мулам, сэктанскім прапаведнікам, для супольнай барацьбы з узрастаючым бязбожжам сярод працоўных.

Посьпехі 5-годкі, дасягнутыя працоўнымі СССР пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, наносяць руйнуючы ўдар па рэлігіі і зьяўляюцца галоўнейшай прычынай росту бязбожжа ўнутры краіны Саветаў. Вялізарны рост ударніцтва і сацспаборніцтва сьведчаць аб тым, што вялізарна вырасла палітычная сьвядомасьць мас, што ў масах шырока прыжыўляецца камуністычныя адносіны да працы, а гэта, як адзначае важнасьць, пісаў таварыш ЛЕНІН, для перамогі сацыялізму. Праца зрабілася ў нас асфарвай гонару, славы, доблесьці і геройства» (СТАЛІН). Вялізарных посьпехаў дасягнула культурная рэвалюцыя ў нашай краіне.

Мы ўпэўнены ідзем па шляху «перамаганьня перажыткаў капіталізму ў сьвядомасьці людзей». Антырэлігійная работа разгортваецца ня мірна і спакойна, а праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Кулак, нэпман, шкодник упарта супраціўляюцца з мэтай захаваць сацбудаўніцтва. Для гэтага выкарыстоўваюць рэлігію.

Яўрэйскія клерыкалы імкнуцца навязаць працоўным яўрэям, у сувязі з ісьненьнем рэлігійнымі сьвятамі і «прозьнымі днямі», набыта ў дзень рэлігійнага сьвята «Рош-гашона» (новы год) вызначаецца на небе ёсьць кожнага чалавека на ўвесь надыходзячы год а ў суботы дзень «Йом-Кипур» на небе ад бываецца суд над кожным чалавекам паасобку і выносіцца богам канчатковы прыгавар. Гэтым клерыкалізм імкнецца падарваць у працоўных веру ў свае ўласныя сілы, у сацбудаўніцтва, стварыць атмасфэру пэўпэйнасьці ў посьпех сацбудаўніцтва.

Яўрэйская рэлігія, яе рэлігійныя сьвяты, як і ўсе іншыя рэлігіі, заўсёды верна служыла і служыць адзінай мэце—асьвятленьню і ўзмацненьню ўлады эксплёататараў, затушоўваньню клясавых супярэчнасьцяй, аду манываньню працоўных мас рэлігійнай атрутай і вучэньнем аб нацыянальным адзінстве.

З асаблівай злобай равіны цяпер выступаюць супроць краіны саветаў, выконваючы волю кусьнетвага капіталу. Равіны былі ў першых радох барацьбітоў окрыжвога шаходу» супроць СССР. Вядома, што равіны Польшчы, Амэрыкі, Англіі і іншых краін узмоцнена вядуць прапаганду за інтэрвэнцыю ў СССР. Парыскі равін наладзіў нагаду на сумеснае маленьне з каталіцкімі ксяндзамі аб зьнішчэньні Савецкай улады. Ерусалімскія равіны склалі малітву, якую раяць чытаць «братом яўрэям»: «Да будзе воля твая, госпадзі, каб ты адпомсьціў за сваё імя грэшнікам, якія зануць сябе бальшавікамі, і зьнішчыў іх уладу з твару зямлі». Яўрэйскія равіны ў Заходняй Беларусі на межах з БССР адкрылі яўрэйскія школы (эшыботы) і гэтыя школы яны лічаць пасадзіцкі супроць бальшэвізму. Орган яўрэйскіх клерыкалаў у Латвіі «Фрыморген» сказдзіцца, што супроць бальшавікоў толькі пішуць, а інтэрвэнцыі няма. Яўрэйскі клерыкалізм зрабіўся тым вазэ нічым сьцягам, пад якім яднаюцца ўсе яўрэйскія белагвардзейцы і інтэрвэнты. Пад сьцягам клерыкалізму ідзе об'яднаньне сіяністаў, бундаўцаў і іншых фашыскіх і сацыял-фашыскіх партый.

Шматлікія факты сьведчаць аб тэй злобе і нянавісьці, з якой яўрэйскі клерыкалы, як і клерыкалы іншых рэлігій, вядуць падрыўную работу ўнутры нашай краіны, каб зьмяншыць тэмпы сацбудаўніцтва, сарваць выкананьне прамфінпляну, перашкодзіць калектывізацыі, паселіць розьнь унутры пралетарыяту і распаліць на цыянальную варожасьць сярод больш адсталай часткі працоўных, якая яна ходзіцца яшчэ пад уплывам рэлігійнай ідэалёгіі.

Працоўныя яўрэі, дзякуючы Каст рычніку скінулі з сябе падвойную эксплёатацыю—боваей і расійскай буржуазіі, аслабанілася ад нацыянальнага бяспраўя і прыгнечаньня і разам з пралетарыятам БССР і працоўнымі масамі сялянства прымаюць актыўны ўдзел у сацбудаўніцтве.

Дзякуючы правільнаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі камуністычнай партыяй мы маем вялікія дасягненьні. Гэтыя дасягненьні відаць з наступных лічбаў: у той час, калі да Кастрычніка на тэрыторыі БССР было рабочых 8.000, з іх яўрэяў 4.000, дык зараз рабочых у БССР звыш 100.000, з іх яўрэяў 32.000. Яўрэйскіх калгасаў ёсьць 90 з лікам калгасьнікаў у яўрэйскіх і мяшаных калгасах—11.800 чал., яўрэйскіх школ ёсьць 260, яўрэйскіх дамоў сацкультуры—18.

Антырэлігійная работа ў нашых умовах зьяўляецца барацьбой за якасьць, за тэмпы сацбудаўніцтва, за ўдарніцтва і сацспаборніцтва, за выкананьне прамфінпляну.

Асноўная задача антырэлігійнай работы ў вёсцы—гэта барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, а гэта значыць барацьба за моцную калгасную брыгаду, за зьдзельшчыну, за правільны ўлік, за бальшавіцкія тэмпы работы, за павышэньне ўраджайнасьці.

Неабходна ўзьняць на вышэйшую ступень антырэлігійную пропаганду, асабліва сярод працоўных нацменшасьцяй БССР.

Не павінна быць ніводнага прадпрыемства, калгасу, саўгасу, школы, вузнай чысьці, установы, дзе-б ня было ячэйкі вайўнічых бязбожнікаў.

На школьную дзейнасьць духоўнікаў усіх масьцей адкажам далейшым ростам нашай актыўнасьці на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, новымі перамогамі да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Даўгаполаў

Адкрыць дэфэкталёгічнае аддзяленьне пры Віцебскім пэдінстытуце

(Ліст групы настаўнікаў)

Улічваючы адсутнасьць у БССР спэцыяльных працаўнікоў па працы з дэфэктыўнымі дзяцьмі, НКА у гэтым 1932-33 навучальным годзе меркаваў адкрыць у Менску дэфэкталёгічнае аддзяленьне пры Пэдінстытуце. Але з прычыны адсутнасьці ліку асоб, жадаючых спэцыялізавацца ў гэтай галіне працы, аддзяленьне адкрыта ня было.

У БССР ёсьць 6 буйных спэцыяльных інстытутаў (для разумова-адсталых—у Віцебску, сьляпых—ў Магілёве, глухаямых—у Мсьціслаўлі. Інстытут сацыяльнага перавыхаваньня і спэцыяльных дзегдамоў для цяжка выхоўваемых—у Віцебску, для імбэцылаў—у Бабруйску, для цяжкавыхоўваемых—у Менску) і 12 школ спэцыяльна для дэфэктыўных (разумова-адсталых дзецей) з іх 4 а 20 груп у г. Віцебску. Ніводная з пералічаных установ у БССР ня мае спэцыяліста-тэарэтыка. Гэтае становішча прымушае патрабаваць ад НКА абавязкова адкрыць ў бягучым навучальным годзе дэфэкталёгічнае аддзяленьне ў адным з буйнейшых гарадоў БССР—паколькі яно не адкрыта ў Менску.

Мы лічым, што г. Віцебск мае ўсе магчымасьці для адкрыцьця вячэрняга дэфэкталёгічнага аддзяленьня пры вячэрнім пэдінстытуце, як з боку забясьпечаньня слухачамі (наяўнасьць 6 спэцыяльных установ з 37 працаўнікамі) і лектарскага складу (пэдінстытут, псыхотэхніка), што адначасова дасьць ашчодак у сродках: непатрэбнасьць для слухочаў стыпэндый і інтэрнату, бо яны працуюць у школах і паводле гэтага маюць сродкі да існаваньня.

Калектыў настаўнікаў Віцебскіх дэфэктыўных установ для разумова-адсталых дзяцей патрабуе ад НКА хутчэйшага адкрыцьця дэфаддзяленьня пры Віцебскім пэдінстытуце.

Кандыбовіч, Пушкарова, Рызо, Карпінская, Эльына, Лісіцын, Абляцоў, Амасовіч, Жураўская, Бабічава, Андрушкевіч, Бабоўна, Андрэева, Федораў, Романава, Ільцэвіч, Сянькоўская, Зайдзева.

Сапліцкія і Драянкоў развальваюць калгас

(Ліст студэнта)

У калгас «Гром» (Буда-Кашалёўскі раён) пралезла група кулакоў Сапліцкіх, якія разам з брыгадзірам Драянковым сыстэматычна крадуць калгасную маёмасьць. Ня гледзячы на тое, што справа аб крадзяжу Сапліцкімі і Драянковым 500 пуд. бульбы знаходзіцца ў сьледчых органах усё-ж яны засталіся кіраўнікамі калгасу і працягваюць сваю шкодніцкую работу.

Вясною г. г. Сапліцкімі і Драянковым было ўкрадзена 500 пуд. бульбы, 4 сьвіньні, некалькі парасят з фэрмы, 30 новых хамутоў і шмат іншае зброї. Нядаўна яны ўкралі бульбу з 2 га. Калі мы прышлі ў калгас арганізаваць дэпутацкую групу і групу садзейнасьці РСІ, дык старшыня калгасу вельмі ворожа сустрэў нас, кажучы, што «начальнікаў» ім непатрэбна (гэта ён дэпутацкую групу лічыў начальнікамі). Запісалася ў дэпутацкую групу 7 чал. і групу садзейнасьці РСІ 5 чал.

На наседжаньні праўленьня Драянкоў і старшыня калгасу выступілі супроць гэтых кандыдатур, кажучы, што «розных груп і фракцый нам навязваць ніхто ня можа». Але ўсё-ж праўленьне згадзілася, каб дэпутацкая група існавала. На агульным сходзе мы ня прысутнічалі і сход праводзіў старшыня. А таму сход групе садзейнасьці РСІ «не дазволіў існаваць», а ў дэпутацкую групу запісалі Сапліцкіх, а беднату выкінулі.

На наседжаньні праўленьня было пастаўлена прадаць на калгасным базары 2 пуды масла і бідон сьмятаны, але так нічога і не прадалі, бо ўсё, што было прызначана для калгаснага базара, ў тую-ж ноч пакралі.

Сапліцкія ня толькі крадуць, але проста шкодзяць. Перад уборачнай кампаніяй яны ўкралі перадатачны ланцуг ад жняркі, а калі быў куплен другі ланцуг, дык яны зьнялі шасьцярню, каб затрымаць уборку. Калі беднота патрабавала ад праўленьня ўзяць малатарню з МТС, то Драянкоў перашкодзіў гэтаму.

Такіх фактаў многа.

У выніку такога кіраўніцтва, насенная канюшыня засталася ня скошнай, ня ўбрана га 5 сена, пагнілі проса і канопліі, бульбы яшчэ не капаюць, сяўба таксама ідзе марудна. А старшыня калгасу разам з членамі праўленьня п'янствуюць, праца стаіць на месцы.

Студэнт інстытуту савецкага будаўніцтва і права Мацюхевіч.

„Не падабаецца, можаш выйсьці з калгасу"

(Ліст рабочага)

Я хачу расказаць праз газэту «Савецкая Беларусь», як ў калгасе «Чырвоны Жлобін» выконваюцца дырэктывы партыі і ўраду.

Веснавая сяўба ў гэтым калгасе ішла самацёкам. Зьдзельшчыны ні было і зараз няма. 5 гектараў засталося не засеянай і нават не ўспаханай. Плян веснавой сяўбы на сходзе калгасьнікаў абгаварвалі.

Але гэта-ж усё яшчэ «дробязі». Пра ўленьне рабіла спраны больш сур'ёзныя. За злучку кароў бралі па 10 руб., а квітанцыі не выдавалі, зараз гэтыя грошы ніякаму кантролю не падаюцца. Увесну праўленьнем была раз базарана бульба, а жаб спадручней было красьці, вартаўніка зьняла з працы. Тое-ж было і з зернем. 200 пуд. ячменю невядома дзе дзелася. У кнізе гэты ячмень выведзены ў расход быццам для корму сьвіней, а на самой справе сьвіней кармілі гнілымі буракамі і бульбай. Малако з малочнай фэрмы адпускаецца без уліку. Члены праўленьня маюць свае каровы, а з фэрмы малако бяруць.

У часе сенажосу ўвесь час п'янствавалі. Старшыня даваў грошы на водку, а рахунак пісалі «на касьбу». Усё сена не скасім кармоў да вясны для калгаснай жывёлы ня хопіць. Старшыня калгасу добры гаварыш з вагадчыкам крамы Марозавым. Таму старшыня калгасу адпусьціў Мароваву плуг, а Марозаў адпусьціў быццам для калгасу 5 пар сапог і 170 мэтраў мануфактуры, і ўсё гэта падзялілі памж членамі праўленьня, а пастух усё лета пасьвіў басяком і яму сапог ня далі.

Калі калгасьнікі кажуць што небудзь гаварыць аб станоўнічы калгасу, старшыня калгасу заўважае: «не падабаецца,—можаш выйсьці з калгасу».

Рабочы электрастанцыі Лавецкі Ф.

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя лічыць, што Жлобінскі райкалгасаюз, РСІ павінны тэрмінова прыняць меры да адпаўраўленьня калгасу «Чырвоны Жлобін». Аб прынятых мерах рэдакцыя просіць паведаміць.

Харчовыя канфэрэнцыі ўзьнімаюць новую хвалю актыўнасьці

Накіраваць энтузіязм рабочых мас на канкрэтныя справы

Высунуты дынамаўцамі (Масква) новы мэтад мабілізацыі ўвагі і энэргіі рабочай клясы на стварэньне ўласнай харчовай базы—*харчовыя канфэрэнцыі*—ахапіў па БССР каля *20 буйных фабрык і заводаў*. Набралася багата матар'ялу, які дае магчымасьць падвесьці першыя вынікі вялікай палітычнай работы.

Аб чым гаворыць гэтыя матар'ялы? Харчовыя канфэрэнцыі *ўскалыхнулі рабочыя масы*, паставілі перад імі ва ўсёй шаўнаце важнейшыя пытаньні стварэньня ўласнай харчовай базы, далейшага палепшаньня рабочага снабжэньня і трамадзкага харчаваньня. На радзе прадпрыемстваў харчовыя канфэрэнцыі выклікалі новую хвалю актыўнасьці і гатоўнасьці максымальна падтрымаць гэтую справу. Амаль на ўсіх прадпрыемствах, пры вырашэньні пытаньня аб фінансаваньні разьвіцьця прыгарадных гаспадарак, рабочыя аднагалосна абавязаліся прыняць удзел сваімі ўкладамі. Рабочыя *Магілёўскай фабрыкі шоўку* пастанавілі выпусьціць унутры-фабрычную пазыку ў памер 10 проц. патрэбнай сумы, г. зн. згадзіліся ўнесьці 100 тыс. руб. Рабочыя «Бальшавіка» пастанавілі ўнесьці 10 проц. патрэбнай сумы і г. д. Але гутарка ішла ня толькі аб грошах. Рабочыя *Гомсельмашу* пастанавілі адпрацаваць на заводзе *6 выходных дзён* і ўвесь заработак—*каля 60 тыс. руб.*—унесьці на разьвіцьцё свайго каапгасу. Канфэрэнцыя *Барысаўскага камбінату «Камінтэрн»* пастанавіла арганізаваць *4 суботнікі* і групы аддаць на ўмацаваньне харчовай базы.

Шэфства паасобных цэхаў, брыгад, зьмен над пэўнымі аб'ектамі прыгарадных гаспадарак прыняла *масавы характар*. Сям-там шэфства адразу давала рэальныя результаты. Дрэваапрацоўчы цэх *Гомсельмашу*, узяўшы шэфства над трусаводствам, арабіў добрыя трусатнікі. Брыгады і зьмены *Бярэзінскага камбінату* (Барысаў), узяўшы шэфства над паасобнымі вучасткамі прыгараднай фэрмы, дабіліся стопроцантнага выхаду рабочых на ўборку. 8 *лепшых ударнікаў камбінату ўступілі ў партыю.*

Ня ўсюды гэту актыўн сьць скарысталі

Усе гэтыя факты характарызуюць энтузіязм, з якім рабочая кляса спаткала шырокія мерапрыемствы партыі па далейшым палепшаньні яго бытавога становішча. Але не на ўсіх прадпрыемствах фабрычна-заводзкія арганізацыі здолелі накіраваць уздым актыўнасьці рабочых мас на канкрэтныя справы, ня ўсюды гэту актыўнасьць выстарчальна скарысталі. Таму мы маем рад фактаў, калі, ня гледзячы на добрыя рэзалюцыі і вялікія пляны, арганізацыі нічога не зрабілі, каб дапамагчы сваім прыгарадным гаспадаркам перамагчы труднасьці гэтай восені, каб умацаваць фундамант для стварэньня ўласнай харчовай базы бліжэйшага будучага. Некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў лічылі, што даволі прыняць рэзалюцыю—«прасіць Белкапсаюз вызначыць гаспадарку з патрэбнай колькасьцю жывёлы, інвэнтаром, набудовамі» і г. д. (такія рэзалюцыі прынялі канфэрэнцыі Гомсельмашу, Віцебскага пічацінага камбінату, гарбарні «Бальшавік» і інш.), каб забясьпечыць сабе харчовую базу. А кіраўнікі Бярэзінскага камбінату зрабілі яшчэ больш радыкальна, падсунуўшы рабочым рэзалюцыю, у якой гаворыцца. «*Абавязаць* заводакіраўніцтва адпусьціць 155 тыс. руб., Белкапсаюз—100 тыс. руб. і пайшчыкаў—25 тыс. руб.».

Дайце нам усё гатовае, дайце мільён у прыдачу (Магілёўская фабрыка шоўку патрабуе 1 мільён руб., Гомсельмаш—каля 3 мільёнаў і т. д.) і тады мы сябе пакажам... І гэта замест таго, каб *паказаць сябе сапраўды добрымі гаспадарамі на тых харчовых вучастках, кіраўніцтва якімі даручыла ім рабочая кляса.*

Сьпіной да грамадзкага харчаваньня

Кіраўнікі *Бярэзінскага камбінату*, у тым ліку каапэратары, ня здольны палепшыць грамадзкае харчаваньне. Толькі на харчовай канфэрэнцыі яны паставілі пытаньне аб пераходзе на паблюдную сыстэму і мараць толькі з 1 студзеня 1933 году даць рабочым адно мясное і адно рыбнае блюда ў пяцідзённу. Можна сябе ўявіць, якім гонарам карыстаецца *такое* грамадзкае харчаваньне. Нядзіва, што рабочы камбінату лічыць за лепшае харчавацца дома. У той-жа час на камбінаце ня ўмеюць нават скарыстоўваць адыходы сталовых для прыкорму сьвіней і трусоў і адыходы часта выкідваюцца на вуліцу.

Тое-ж самае назіраецца на Віцебскай фабрыцы *«Сьцяг Індустрыялізацыі»*. Да гэтага часу ў сталоўцы няма паблюднай сыстэмы, няма бракеражу. Самазагатоўкі прадуктаў для сталовай вядуцца ня ў глыбінных пунктах, а на *гарадзкім базары*. Прыгарадная гаспадарка мае 900 га, з іх асвоена *толькі 400*. Праполку не забясьпечылі рабочай сілай—адсюль нізкая ўраджайнасьць. Затое вялікі «ўраджай» у ЗРК, які перавыдаткава

ЗА ГРАНІЦАЙ

Хваля палітычных працэсаў

На 106 год каторгі прысуджаны 27 маладых рэвалюцыянэраў

ВІЛЬНЯ. Польская прэса паведамляе, што Навагрудзкі акруговы суд на выязной сэсіі у Воранавічах 20—21-га верасьня разгледзеў 5 палітычных справаў беларускіх рабочых і сялян, якія абвінавачваліся ў прыналежнасьці да КПЗБ. На лаўцы падсудных па пяці справах 27 чалавек.

Акруговым судом маладыя сяляне з вёскі Сіняўская Слабада, (воласьць Турэц) прысуджаны: Васілеўскі Барыс—на 6 гадоў каторгі, Балабановіч Арсень Парэцкі Яўгень і Тарасэвіч Мікола—на 4 гады каторгі кожны. Балабановіч Яўгень—на 3 г. каторгі.

Сяляне той-жа воласьці Сьвірыд Ян, Буд Пётр, Кергет Уладзімір і Міхась, Мікола Смаляннка, Галецкія Ян і Уладзімер, Птэшка Аляксандр, Цаба Аляксандр і Павал, Бусько Аляксей і Пахадэнька Аляксей засуджаны на пяць гадоў каторгі кожны.

Сяляне вёскі Люшнева, Маўчацкай воласьці—Сергей Александар засуджаны на пяць гадоў каторгі, Сьлівончык Мікалай і Зянько Александар—на чатыры гады каторгі кожны. Сяляне вёсак Жэрабковічы і Канюхі, Ляхавіцкай воласьці,—Глобош Андрэй і Лойка Ян засуджаны на пяць гадоў каторгі кожны. Брыневіч Сьцяпан, Лойка Вінцук і Шэбех Хведар—на чатыры гады каторгі кожны.

Усяго 27 сялян па пяці справах засуджаны на 106 гадоў каторгі.

***

ВІЛЬНЯ. 22-га верасьня ў Віленскім апэляцыйным судзе разглядалася справа пяці сялян з вёсак Адамава і Некрашава, Жухавіцкай воласьці, Стаўпецкага павету—Захара Войка, Янкі Жобенка, Янкі Гінэда, Давіда Кураша і Васіля Рагача па абвінавачваньні ў прыналежнасьці да КПЗБ.

Характэрна, што адзіным «рэчовым» довадам віны падсудных была камуністычная газета «Чырвоны сьцяг», знойдзеная ў аднаго з падсудных. Акруговым судом Войка быў прысуджан на пяць гадоў каторгі, а рэшта падсудных на чатыры гады. Апэляцыйны суд зменшыў тэрмін зьняволеньня падсудным кожнаму на адзін год.

Манархічнае віленскае «Слово» паведамляе, што 6-га кастрычніка ў акруговым судзе ў Горадні пачаўся вялікі палітычны працэс на справе Сымона Лазарчыка і яго таварышоў—усяго 25 чалавек. Падсудныя абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да КПЗБ. Працэс працягнецца некалькі дзён. На суд выклікана шмат сьведак,—выключна палітэйскіх і шпіёнаў.

Навагрудзкі акруговы суд засудзіў на тры гады каторгі селяніна Сяргея Галушка, з вёскі Сававіч Карэліцкай воласьці, які абвінавачваўся ў камуністычнай дзейнасьці.

Адозва Віленскага антываеннага камітэту

ВІЛЬНЯ. Ня гледзячы на жорсткі тэрор, віленскі рабочы антываенны камітэт разгортвае шырокую папулярызацыю маніфэсту Амстэрдамскага кангрэсу. Камітэт выдаў спэцыяльную адозву да віленскіх рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі, у якой гаворыцца:

«Мінулы толькі 18 год з таго часу, як над сьветам запалілася жудаснае зарыва імпэрыялістычнай вайны, і ўжо зноў навісьлі хмары ваеннай навалыцы. Капіталізм ня можа існаваць без вайны, як ня можа існаваць без эксплёатацыі мас і без рынку збыту. Хлусьлівая пацыфістская прапаганда Лігі нацый адбываецца пад гарматныя стрэлы ў Манчжурыі, дзе японскі імпэрыялізм, пры патураньні іншых капіталістычных дзяржаў, рыхтуе напад на СССР».

Далей адозва падкрэсьлівае, што «ня гледзячы на жорсткае прасьледваньне антываеннай кампаніі і арышт першага антываеннага камітэту рабочых і інтэлігенцыя Вільні горача адгукнулася, на адозву ініцыятараў міжнароднага антываеннага кангрэсу ў Амстэрдаме».

У канцы камітэт заклікае ўсіх рабочых, сялян і працоўную інтэлігенцыю а актыўнай барацьбы супроць падрыхтоўкі новай сусьветнай вайны.

«Мы—заяўляе адозва, — рабочыя лажнейшых галін віленскай прамысловасьці, яднаючы ў сваіх радах беларускіх, яўрэйскіх і літоўскіх рабочых з ППС і ББ, наперакор сваім здрадніцкім правадыром, якія адмовіліся прыняць удзел у антываеннай кампаніі, у адзным фронце з усімі рабочымі, сьмела ўзьнімаем свой голас супроць імпэрыялістычнай вайны, за абарону СССР.

«Прэч вайну».

Баі беспрацоўных з паліцыі

ВАРШАВА. 6-X. Каля 30.000 беспрацоўных Верхняй Сілезіі чэрпаюць сродкі на харчаваньне ад продажу вугалю здабываннага імі з так званых «гора-шахт»—ямін. Вугаль капаецца беспрацоўнымі ў мясцох, дзе пласты, якія не экспляатуюцца вугляводчыкамі з прычыны нерэнтабельнасьці, выходзяць на паверхню зямлі. Паліцыя перашкаджае «незаконнай» здабычы вугалю, канфіскуе вугаль беспрацоўных, узрывае дынамітам «гора-шахты» і к. д. Беспрацоўныя даюць паліцыі актыўны адпор.

Учора каля мястэчка Міколава (Верхняя Сілезія) на гэтай глебе адбылася бурная сутычка беспрацоўных з паліцыяй. Толькі з прыбыцьцём падмацаваньняў паліцэйскім удалося выцясьніць беспрацоўных з «гора-шахтаў».

Часта беспрацоўныя арганізуюць напады на панскія і кулацкія гаспадаркі, каб здабыць бульбу хлеб. Гэтымі днямі каля Сьвібэнтахавіцы (Верхняя Сілезія) натоўп у некалькі сот беспрацоўных зрабіў напад на бульбяныя палі. Толькі з дапамогаю мощных паліцэйскіх атрадаў беспрацоўныя былі расьсеяны.

Буржуазная праса паведамляе пра выступленьні беспрацоўных супроць увядзеньня прымусовай працы. 2-га кастрычніка павяло вае кіраўніцтва ў мястэчку Міхалковічы (Верхняя Сілезія, каля Катавіцаў) выклікала ўсіх беспрацоўных, каб адпрацаваць за атрыманую імі дапамогу. Беспрацоўныя адказалі на гэта дэманстрацыяй. Яны ўварваліся ў памяшканьне кіраўніцтва павету і зьбілі старшыню.

Напады беспрацоўных на цягнікі з вугалем узрастаюць

ВАРШАВА. 7-X. Напады беспрацоўных на вугольныя цягнікі прымаюць усё больш жорсткі характар. Напрыклад, 6-га кастрычніка шматлікая група ўзброеных беспрацоўных начала на вугольны цягнік блізка станцыі Яськовіцэ (Кутноўскі павет, Варшаўскае ваяводзтва). Паліцэйскія, якія суправаджалі цягнік, пачалі страляць у беспрацоўных, на што апошнія адказалі залпам і ўцяклі.

Калі цягнік затрымаўся на наступнай станцыі, служачы чыгункі знайшоў на адным з вугольных вагонаў труп салдата, які трымаў у руках мяшок з вуглем. Забіты аказаўся радавым салдатам, які будучы ў водпуску, прыняў удзел у нападзе беспрацоўных на цягнік.

Забастоўка працягваецца

ВАРШАВА. 7-X. Забастоўка рабочых газавага заводу ў Варшаве працягваецца ўжо трэці дзень за ўмовах узмоцненага тэрору супроць бастуючых. Вайсковыя часьці пад кіраўніцтвам афіцэраў і пры дапамозе групы фашысцкіх студэнтаў Варшаўскага політэхнікуму праводзяць штрэйк брэхэрскую работу. Для аховы штрэйкбрэхэраў арганізаваны моцныя паліцэйскія часьці.

Ня гледзячы на здрадніцкую тактыку прафбюракратаў і ўзмоцнены тэрор, бастуючыя праяўляюць вялікую стойкасьць. Забастоўчы настрой сярод рабочых іншых гарадзкіх прадпрыемстваў (трамвайшчыкі, водаправодчыкі і электрастанцыя) узмацняецца.

Учора ў Варшаве распаўсюджваліся лістоўкі, якія заклікалі да ўсеагульнай забастоўкі мунісіпальных рабочых сталіцы. Лістоўкі канфіскаваны паліцыяй.

Францыя скалачвае антысавецкі саюз

ПРАГА. 7-X. «Народна політыка», якая блізка стаіць да Крамаржа і падтрымлівае сувязі з францускімі нацыяналістычнымі коламі, зьмяшчае падробязныя перагавораў, якія адбываюцца ў сучасны момант у Жэнэве паміж кіраўнікамі Малой Антанты і прадстаўнікамі Польшчы і Францыі. Па зьвестак газэты, Францыя імкнецца да стварэньня паміж гэтымі краінамі цясьнейшага ваеннага саюзу. У цэнтры перагавораў стаіць нібыта пытаньне аб франка-польскіх адносінах.

Паводле зьвестак газэты, сучасны ваенны дагавор паміж Францыяй і Польшчай павінен быць пашыраны, прычым у цэнтры яго павінна стаяць згода аб перадачным задушэньні ўсякімі сродкамі любой спробы перагляду граніц, устаноўленых Вэрсалем. Пры гэтым Францыя, нібыта, лічыць мэтазгодным дапоўніць франка-польскі дагавор новымі дагаворамі, якія-б ўзаемна гарантавалі граніцы названых дзяржаў і прадугледжвалі-бы сумесны дыпляматычны выступленьні Францыі і Чэха-Славакіі з аднаго боку і Польшчы і Чэха-Славакіі—з другога. Тым самым была-б пашырана Малая Антанта, паколькі да новага дагавору аб бясьпецы маглі-бы пасьля прылучыцца Югославія і Румынія. У выпадку канфлікту паміж Германіяй і Польшчай, усе іншыя ўдзельнікі гэтай ваеннай згоды павінны былі-б выступіць супроць Германіі.

«Народна політыка» асабліва падкрэсьлівае тую акалічнасьць, што аб перагаворах паміж названымі дзяржавамі праінфармавана Англія і што гэта ініцыятыва Францыі сустракае з боку англійскага ўраду пэўны спагад. Газэта паведамляе, што супроць гэтай францускай канцэпцыі гарантый бясьпечнасьці не пярэчыць і амэрыканскі наглядчык у Жэнэве. Газэта лічыць ня выключаным удзел Англіі ў далейшых перагаворах аб стварэньні новага ваеннага блёку.

Англія ня мае падзеі на скліканьне канфэрэнцыі 5 дзяржаў

ПАРЫЖ. 6-X. Гавас паведамляе: «Англійскі пасол у Францыі паведаміў Эрыё, што дата скліканьня праектаванай канфэрэнцыі ў Лёндане адтэрмінавана. Аб мэн думкамі наконт гэтага пытаньня паміж Лёнданам і Парыжам працягваецца і працякае ў вельмі сяброўскім духу.

***

ЛЁНДАН. 6-X. Дыплёматычны аглядчык «Дэйлі тэлеграф» заяўляе, што ў Лёндане больш ня маюць падзеі на скліканьне канфэрэнцыі пяці дзяржаў бо лёс яе прадвызначаны пазыцыяй Парыжу і Бэрліну.

Паводле зьвестак газэты, Эрыё цьвёрда пастойвае на тым, што Лізе нацый павінна належыць права міжнароднага кантролю над узброеньнямі, павінна быць устаноўлена процэдура вызначэньня нападаючага боку, што трэція бакі павінны адмовіцца ад права заставацца нэйтральнымі.

1.000 арыштаваных у Заходняй Украіне

ВАРШАВА. 7-X. Буржуазны друк замоўчвае сапраўдныя разьмеры новай хвалі «пацыфікацыі», якая праводзіцца на Заходняй Украіне, пад відам ліквідацыі лесай масавай сялянскай арганізацыі «Сельроб». Так, вядома, што акрамя «Сельроба» разгромлены таксама і левыя украінскія культурна-асьветныя («Просьвіта») і кааперацыйныя арганізацыі. Праўленьні арыштаваны. Вобыскі адбыліся ў мясцох, дзе працуюць ня толькі ў Львове, але і ва ўсіх паветах Львоўскага, Тарнопальскага і Станіславаўскага ваяводзтваў, а таксама на Валыньшчыне. Да гэтага часу арыштавана больш 1000 чалавек.

Працэс 28 салдат

ВАРШАВА, 7-X. Паводле паведамленьня газэты «АБЦ», у варшаўскіх вайсковым судзе пачаўся вялікі працэс 28 салдат, якія абвінавачваюцца «ў камуністычнай агітацыі ў вайсковых часьцях на тэрыторыі ўсёй Варшаўскай Вайсковай акругі».

***

ВАРШАВА. 7-X. У Сасновіцкім акруговым судзе (Дамброўскі вугольны басэйн) пачаўся слуханьнем справа 32-х рабочых, якія абвінавачваюцца «ў прыналежнасьці да кампартыі і ў ўдзеле ў нелегальных зьездах і спро

НЕЗАСТАНАУЛІВАЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ

Пяцідзённік падвядзеньня выкінаў агляду зрабіць пачаткам далейшай настойнай барацьбы за перабудову спажывецкай кааперацыі

Што даў агляд ў Заслаўскім раёне

Зьмешчаны матар'ял аб Заслаўскім раёне паказьнік значных зрухаў, якія адбыліся за час агляду ва ўсіх СССР гэтага раёну. Высоўваем Заслаўскі раён на прэм'яваньне за посьпехі ў выкананьні плянаў і за добрую масавую работу.

Матар'ялы агляду кізавой кааперацыі ў Заслаўскім раёне паказваць аб значных зрухах у рабоце спажыткаапэрацыі Заслаўшчыны. Па асобных-жа ССТ асобныя паказьнікі работы кааперацыйнай сеткі значна перавышаюць плянавыя меркаваньні і паказьнікі папярэдніх кварталаў. Вядомна, што агляд кааперацыі, тут прайшоў, як сапраўды масава-палітычная кампанія, якая мабілізавала ўвагу ўсіх прадпрыемстваў на выкананьне пастаўленых перад кізавой кааперацыяй задач, на барацьбу за перабудову работы кааперацыі адпаведна задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

І сапраўды. За час агляду кізавой кааперацыі, вылучанымі брыгадамі сельсавітаў праведзена па сямі ССТ раёну 41 сход пайшікаў, дзе апрача дакладаў аб значэньні месячнікі заслуханы і актыўна абгавораны справа адзачы ОСТ і крам. Такімі сходамі ахоплена звыш 500 пайшікаў пры чым 50 проц. прысутных на сходах былі жанчыны.

У сувязях за справаздачных дакладах пайшікамі выяўлены недахопы і злоўжываньні ў асобных зьвеньнях кааперацыйнай сыстэмы, высунута шмат каштоўных прапаноў па палепшаньні работы. Актыўны ўдзел у работе кааперацыі мае пайшікаў, брыгад па агляде, месцовых арганізацый якраз і забясьпечыў дасягнутыя посьпехі.

Асноўнае, што забясьпечыла пасьпяховае выкананьне плянаў спажысцтва Заслаўшчыны, гэта правільнае ажыцьцяўленьне ва ўсёй рабоце ССТ і крам гаспадарчага разьліку, увядзеньне ў зьдзельшчыны і заахвочвальных мерапрыемстваў у аплаце працы работнікаў кааперацыі. Асабліва адчувальна адбіліся спрыяльныя вынікі гаспадарчага разьліку на выкананьні плянаў мабілізацыі сродкаў чкі перавыкананьне з кварталу ў квартал. Плян 1-га кварталу па паявых узносах, авансах і ўзносах на будаўніцтва выканы на 100 проц, II—ага 183 проц, III—на 123,1 проц. Пры гэтым асобныя ССТ у выніку адпаведнай работы плян збору паявых узносаў значна перавыканалі, хаця увогуле-ж на гэтай галіне ў раёне наглядаецца адставаньне. Напрыклад, Анусінскае ССТ плян збору паявых у І квартале выканала на 197,3 проц., у II—ага 72,8 проц., у III—на 115,4 проц. Шэршунскае ССТ адпаведна дала 156,6 проц., 74,6 пр., 101,2 проц., 106,3 проц. Значна перавыкананы плян збораў на будаўніцтва і авансаў.

Усе ССТ раёну зараз маюць уласныя рахункі ў банку і гэта мерапрыемства яшчэ больш заахвочвае іх у барацьбе за мабілізацыю сродкаў і стварэньне ўзорнай фінансавай базы.

Плян тавараазвароту за III квартал ССТ Заслаўшчыны выканалі на 110,1 проц. І гэта зьяўляецца ня выпадковым перавыкананьнем пляну за лік «нечака нага» паступленьня партыі ходкіх тавараў, а вынік сапраўднай барацьбы за тавараазварот, цесна ўвязана з барацьбой за выкананьне іншых плянаў. Расгарнуўшы ў трэцім квартале сама закупкі, ССТ Заслаўшчыны давялі іх да сумы ў 30000 руб (што між іншым пэрыштаб лічыць недастатковым). Пры ніты заходы да выкананьня тавараных рэсурсаў за лік выробу тавараў шырокажыву. Напрыклад, Шапілёўскае ССТ заключыла дагавор з калгаспам «Юны Камунар» на выраб з ломжалеса скабяных вырабаў, а з калгаспам «Новы Быт»—на выраб бандарных вырабаў. Самазакупкі-ж разгортваюцца галоўным чынам угутры раёну і закупаліся тавары выробленыя з мясцовай сыравіны (напр. пле ценныя вырабы і г. д.).

За час агляду ў раёне дасягнута максімальная хуткасьць абарачальнасьці тавараў з базы да спажыўца. Гэты шлях тавар праходзіць звычайна за тры-чатыры дні. Хуткасьць тавараазвароту павялічылася за час агляду —14 дзён замест 18 плянавых. Значна зьніжаны таварныя астачы, пры чым адным з мерапрыемстваў барацьбы супроць замарожваньня тавараў зьяўляецца перакідка залежалых тавараў з аднаго ССТ у другое і больш ўважлівы падбор асартымэнту на кустбазе.

У выніку ўсяго гэтага ССТ раёну працуюць з прыбыткам, які з кожным месяцам павялічваецца. Так, калі за першае паўгодзьдзе ССТ мелі чыстага прыбытку 31.022 руб., дык за адзін лістапад месяц прыбытак вызначаецца сумай у 6722 руб., а жнівень даў ужо 7.101 руб. Адпаведна гэтаму дасягнута сыстэматычнае зьніжэньне адміністрацыйна-гаспадарчых і накладных выдаткаў, якія зьнізіліся з 4,7 проц. агульнага тавараазвароту ў першым паўгодзьдзі да 3,59 процантаў у жніўні.

Адным з прычын, стымулюючых пасьпяховае выкананьне плянаў сельспажыткамі і асобнымі крамамі, зьяўляецца шырокае ўжываньне заахвочваючых мерапрыемстваў і мер прамадзіцкага ўзьдзейнічаньня на асобныя зьвеньні сыстэмы. Шырока практыкуецца, напрыклад, уручэньне пераходных сьцягоў: чырвонага—перадавым і рагожнага—адстаючым.

Пры гэтым райсаюз і матар'яльна заінтэрэсаваў работнікаў ССТ у атрыманьні пераходнага чырвонага сьцягу. Апрача гонару лічыцца перадавымі ў раёне, работнікі ССТ, якое мае пераходны сьцяг, атрымліваюць і матар'яльную дапамогу ў выглядзе прочантных надбавак да зарплаты на ўвесь час такуль ССТ трымае пераходны сьцяг.

Так, старшыня ССТ за ўвесь час трымаючы пераходнага сьцягу атрымліваў дадаткова (звыш надбавак у парадку зьдзельшчыны, гаспразьліку і інш.) узнагароду ў разьмеры 20 проц. да месячнага заработку, работнікі прыладу—15 проц. і г. д. Адначасова ўстаноўлена адпаведная ўзнагарода старшыням сельсаветаў, сакратарям партячэек раёну абслугоўвачыя ССТ.

Практычным вынікам праведзенага ў раёне агляду кізавой кааперацыі зьявіліся канкрэтныя зрухі ў пастаноўцы грамадзкага харчаваньня. У сталоўках сельспажтаварыстваў за час агляду ўведзена калькуляцыя блюд, папярэдняя фасоўка прадуктаў у буфэтах, значна пашыраны сама загатоўкі, якія вядуцца па выпрацаваным пляне і арганізавана. У выніку ўсяго гэтага якасьць абедаў у сталоўках значна палепшылася.

Гандлёвая сетка па раёне за час з І трудзень павялічана на 22 гандлёвых адзінкі. Крамы і ларкі адчынены галоўным чынам у калгасах і саўгасах. Гэтым павялічэньнем гандлёвай сеткі дасягнута тое, што лік дваароў, якія абслугоўваюцца крамамі, скарацілся з 200 да 150 на кожную краму ў сярэднім, што дало магчымасьць палепшаньня абслугоўваньня спажыўцоў крамамі.

Большасьць ССТ Заслаўшчыны пры малай актыўнасьці ўдзел у пасеўной і ўборачнай кампаніях, шырока разгорнуты практыка заключэньня дагавораў асобных крам і ларкоў з калгаснымі брыгадамі.

У гэтых дагаворах, абгавораных на агульных сходах калгасных брыгад і з удзелам прадстаўнікоў крам, выстаўляліся пэўныя абавязкі абодвых бакоў: брыгада абавязалася выконваць у пэўны тэрмін пэўную колькасьць работы, а крама адпаведна за бясьпечваць брыгаду тварам. Потым на такіх-жа сходах правяралася выкананьне ўзятых абавязкаў.

Здавальняючая работа спажысцтэмы выклікала далейшы рост колькасьці пайшікаў. За час з 1-І—1932 г. па 1-е кастрычніка колькасьць пайшікаў павялічылася з 12000 да 14690 ч., пры чым у гэтым ліку за чэрвень з 1 ліпеня па 1-га кастрычніка кааперавана 968 пайшікаў. Такім чынам зараз у раёне кааперавана 74,2 проц. усяго насельніцтва на ўзросьце звыш 14 год.

Агляд кізавой кааперацыі апрача таго, што ў выніку яго правядзеньня дасягнуты значныя зрухі ў выкананьні плянаў асобных галін работы ССТ і палепшаньні якасных паказьнікаў, значна ажывіў работу спажысцтэмы, працягнуўшы да яе ўвагу грамадзянскасьці і мясцовых арганізацый. Гэтым створаны неабходныя прадпасылкі для далейшага і яшчэ большага ўзмацненьня работы кааперацыі. Такім чынам перад арганізацыямі Заслаўскага раёну зараз паўстае задача: неаслабная увагай да работы кааперацыі, дзейнай дапамогай асобным яе адзінкам, узмацненьнем грамадзкага кантролю дабіцца таго, каб ударная работа ССТ Заслаўшчыны ў часе агляду зрабілася-б штодзённай работай. Трэба зараз, падводзячы вынікі агляду, пырока папулярызаваць вопыт лепшых ССТ, зрабіць іх мэтады барацьбы здабыткам усяе кааперацыйнай работы раёну.

Больш актыўна і рашуча прымяняць да работы кааперацыі прамадзіцкасьць, больш чула прыслухоўвацца да запатрабаваньняў і пажаданьняў пайшікаў, больш уважліва ставіцца выкананьне, усямерна разгортаць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў кааперацыі—вось задачы ня толькі для кааперацыйнай сыстэмы раёну, але і для ўсіх раённых арганізацый.

Апошні пленум ЦК УсеКП(б)у ставіць раённым аб разьвіцьці сельскага гандлю і выдае тавараў спажыўцу даў базавую праграму далейшай барацьбы за ўмацаваньне змычкі рабочай клясы з сялянствам і палепшаньня матар'яльнага становішча працоўных гораду і вёскі. Гэтай барацьбе пашыняй матар'яльнага становішча працоўных гораду і вёскі. Гэтай барацьбе будзе пасьпяховай пры максымальнай увазе і дынамізме рабоце кааперацыі з боку усіх раённых арганізацый.

Л. Н-скі.

«Інтарэсы далейшага ўмацаваньня змычкі рабочай клясы з сялянствам і палепшаньня матар'яльнага становішча працоўных гораду і вёскі патрабуе ўсямернага разгортваньня савецкага гандлю і, ў прыватнасьці, гандлю калгасаў, калгасьнікаў і працоўных адзіначых, ў прыватнасьці, гандлю калгасаў, калгасьнікаў і працоўных адзіначых сялян» (З пастановы верасеньскага пленуму ЦК УсеКП(б)).

З ЗАЛІ СУДА

БАРЫСАЎ. 8-X. (Ад нашага спэцкора). 7-га кастрычніка, а 6 гадзіне ўвечары, у г. Барысаве ў памяшканьні рабочага клюбу у прысутнасьці вялікай колькасьці рабочых з фабрык і заводаў,—выязной сэсіяй Вярхоўнага суда БССР, пад старшыньствам тав. Інсарава, пачалася слуханьнем судовая справа былых работнікаў лесрабкопу на чале з яго праўленьнем. Лесрабкопа абвінавачваюцца ў раскраданьні вострa-дэфіцытных тавараў і збываньні іх на прыватным рынку, вядучы сваю агідную справу ў цеснай сувязі з прыватнікам, гандляром-спэкулянтам, былым фабрыкантам Марыновым, а таксама ва ўчыненьні спэкуляцыйных зьдзелак, якія пацягнулі за сабой недахоп на складзе лесрабкопу 3400 мтр мануфактуры 369 хустак, 740 кгр. аўса, 236 кгр. цукру і шмат іншых прадуктаў і тавараў. Усяго не хапае тавараў звыш чым на 12.000 рублёў.

Сярод абвінавачаных—былы старшыня праўленьня лесрабкопу Макарэвіч, яго намесьнік Казлоўскі З., галоўны бухгальтар Кленскі С., загадчык складам Цыркін Р., загадчыкі складам «Саюзхлеб» Каплан Д. і Раскінд Д., Шыфрын Я., Бэнсон Л., Шулькін Я., і Няхамін З.

Гэтая зграя спэкулянтаў і былых кантрабандыстаў, карыстаючыся бесконтрольнасьцю праўленьня лесрабкому, раскрадала са складу вострa-дэфіцытныя тавары, якія Цыркіным і Казлаковым, Клёнскімі, Раскіндым ды інш. перапрадаваліся на прыватным рынку.

Пры ўтварэньні вобыску ў был. загадчыка складам Цыркіна было знойдзена закапаным ў зямлі 13.000 руб. наяўнымі грашыма, 160 даляраў і рад іншых рэчаў.

Гэтыя злачынствы ў адносінах да вышэйпералічаных прадугледжаны 69 арт. К. К. і пастановай СНК і ЦВК СССР ад 7 жніўня 1932 г. (раскраданьне сацыялістычнай маемасьці).

Судовая справа будзе працягвацца каля пяці дзён.

Мекарынк.

Хроніка

▲ 7 кастрычніка ў Слуцку пушчана новая электрастанцыя на 7000 вольт. Пуск станцыі забясьпечвае ўсе прадпрыемствы гораду электраэнэргіяй і горад сьвятлом.

(ЛЕНТА).

***

▲ За пасьпяховае выкананьне збожжазагатовак калгас імя ЛАНЦУЦКОГА Віцебскага раёну прэзяваны радыёўстаноўкай Віцебскім гарсаветам

***

▲ 14 кастрычніка ў Нова-Барысаве адкрываецца першая раённая выстаўка коняй.

▲ Два нумары кіночасопісу аб падрыхтоўцы да сьвяткаваньня XV гада віны Кастрычніка выпускае Белдзяржкіно на працягу кастрычніка месяца.

***

▲ За парушэньне палітыкі цэн і дырэктыў аб парадку забясьпечаньня рабочых бульбай, вынесена суровая вымова з папярэджаньнем старшыні ЗРК фабрыкі імя Крупскай т. ЛІСУ. і суровая вымова старшыні фабкому тав. ІОФІСУ.

***

▲ Пачаты работы па прыкладцы трамвайнага шляху на Старажоўны яшчэ на 1½ клм. і абсталяваньні зваротнага кальца.

***

▲ 6 вагонаў з рамонту звышплановa выпускае вагонарамонтны завод «Полымя рэвалюцыі» у падарунак на XV гадавіны Кастрычніка. На гэтымжа заводзе 11 брыгад пераводзіцца на гаспадарчы разьлік.

***

▲ Трэст Белдрэва ўключыўся ў правядзеньне ўсесаюзнага конкурсу па рацыяналізацыі і вынаходзтве на наступных тэмах: вынаходзтва лічыльніка підапрадукцыі, лічыльніка для ўліку расьпілаванага бярвеньня і мэханізацыі бярвенных работ, а таксама па распрацоўцы канструкцыі найбольш зручнай і танай мэблі.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Каса з 1 г. дня

Ад 6 кастрычніка Новы гукавы гаваршчы фільм ПЯТНАЦЦАТЫ

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ФІНАНСАЎ СССР
УСЕСАЮЗНЫ З ВОЧНЫ ІНСТЫТУТ ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНЫХ І РАХУНКОВЫХ НАВУК
„ВЗИНО“
З 1 га верасьня АДКРЫТЫ ПРЫЕМ
у інстытут і тэхнікум на 1933 навучальны год.
Інстытут складаецца з трох факультэтаў:
1. фінансавы 2. крэдытны 3. вучотна-эканамічны
Тэрмін навучаньня ў Інстытуце 3 з паловай гады
Тэхнікум складаецца з трох аддзяленьняў:
1. Фінансавага 2. Крэдытнага 3 Вучотнага
Тэрмін навучаньня ў тэхнікуме 3 гады
Інстытут і тэхнікум арганізуюць заняткі ў аб'ёме і па праграмах адпаведна стацыянарным вучобным установам
Слухачы інстытуту і тэхнікума, якія выканалі поўнасьцю вучобны плян адпаведнага факультэтаў альбо аддзяленьняў і прайшлі вустныя іспыты, атрымліваюць пасьведчаньне аб скончаньні інстытуту альбо тэхнікуму з паказаньнем прысвоенай ім кваліфікацыі, згодна агульнага палажэньня аб ВНУ і тэхнікумах
Прыём да 1 лістапада
Пачатак заняткаў—1-га студзеня 1933 г.
Праспэкт, у якім маюцца праграмы, профілі і ўмовы прыёму, высылаецца бясплатна Беларускім аддзяленьнем „ВЗИНО“ (Менск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой № 203)
Беларускае аддзяленьне „ВЗИНО“

На падставе пастановы СНК БССР ад 4-X 1932 г. усе недапастаўкі дроў спажыўцом па становішчы на 1-X-32 г.
НЕ ПАДЛЯГАЮЦЬ ПАКРЫЦЬЦЮ
і на IУ кв. зацьверджаны ў асобныя фонды
Усе наркаматы і аб'яднаньні павінны не пазьней 12 кастрычніка прадставіць Лесазбыту г. Менск разнарадкі на пастаўку дроў асобным прадпрыемствам у IУ кв адпаведна вызначаным фондам.
Не прадставіўшыя разнарадкі ў паказаны тэрмін будуць выключаны са снабжэньня у IУ кв.
Бел. Аддз. САЮЗЛЕСАЗБЫТ

15-га кастрычніка 1932 году, у гор. Менску у клюбе Працасьветы, а 7-й гадзіне ўвечары
адкрываецца
III УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД Т-ВА „ПРЭЧ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ“ БССР
ПАРАДАК ДНЮ ЗЬЕЗДУ НАСТУПНЫ
1. Справаздача Цэнтральнага Савету за час з II-га зьезду і далейшыя задачы таварыства.
2. Аб задачах культурнага будаўніцтва і абавязковай ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.
3. Даклад цэнтральнай рэвізійнай камісіі.
4. Зацьверджаньне новага праекта статуту т-ва „Прэч Няпісьменнасьць“ і палажэньне аб юрыдычным членстве.
5. Выбары.
6. Фракцыя зьезду адбудзецца там жа а 6-й гадз. увечары
Просьба ўсіх дэлегатаў і запрошаных праўстаўнікоў зьявіцца своячасова
ПРЭЗЫДЫУМ ЦС Т-ва „ПРЭЧ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ“ БССР

Рэспубліканскай канторы МЯСА БЫТ
ПАТРАБУЕЦЦА
фінансіст-гал. бухгальтар 1
і бухгальтар 1
эканаміст-плянавік 1,
касір-рахункавод 1.
Аплата па згодзе.
Зьвяртацца: Пляц Волі, 7
Белмясграмтрэст, Сэктар кадраў.

ДАВОДЗІЦЦА да ведама ўсіх устаноў і асоб, што
ЛІКВІДАЦЫЯ БЕЛХЛЕБЖЫВЁЛСАЮЗУ
закончана 5-X 1932 г., з якога часу ліквідком лічыцца РАСПУШЧАНЫМ
Ліквідком

ЗГУБЛЕНЫ:
Парт білет 39-м каў. палком за 1971516 Марголеў І. Л. кв. 2048.
Даведка аб шлюбе з гр. Харчэнка выд. Менскім зваксам кв. 2049.
Атэстат аб скончан. Менск. 7-мігодкі Прэйс С. Л. кв. 2050.
Камсамольскі білет Менгаркомам ВЛКСМ Целушкевіч В. К. кв. 2051.
Камсамольскі білет Менгаркомам КСМ Крылава А. І. кв. 2052.
Парт білет Менскім Гаркомам Вальчук К. Д. № 110 5817 кв. 2053.
Паляўнічы білет выд. Лосўскім с-зам паляўн. Марцінкевіч А. В. кв. 1848.
Кніжка выд. ІТР: за № 796029 Левін А. Р. кв. 1849.
Кандыдацкі біл. выд. Бабруйскім гаркомам за № 51166 Колапкін А. Ф. кв. 1851.
Пашпарт 3-м адзелен. міліцыі Доўнер В. А. кв. 2054.
Асаб. пасьв. на права кіраван. аўтамашыны Гэйрылін М. П. кв. 2056.
Камсамольскі білет Владывастокскім гаркомам КСМ Сыльчэнка І. Б. кв. 2057.
Інвалідная кніжка выд. Менгарсабесам Брэк Т. С. кв. 2058.
Конвокая картка Развакайскага раёна Кавальчук М. Ф. кв. 2059.
Парт кандыдацкая картка за № 68765 Менгаркомам Шлэйгель А. Р. кв. 2060.
Пэнсыённая кніжка выд. Менгарсабесам Балыцкоўская Жыдовіч А. Н. кв. 2061.
Конвокая кніжка выдадзеная Смаляніцкім с-с на імя Белаўскага Л. А. квіт. 2062.
Квіток аб здачы на папраўку галёшняка 87527 на імя Мазо Л. С. квіт. 2063.
Партыйны білет № 816433 выдадзены Рэчыцкім гаркомам на імя Архіпова Н. М. квіт. 2064.
Партыйн. біл. 1105131 выд. Менгаркомам на імя Гоберман Ш. К. кв. 2065.
Партызанскі білет, выдадзены Смалявіцкім РВК на імя Пратасевіч П. Н. кв. 1890.
Кандыдацкая картка, выдадзеная Смалявіцкім РК КП(б)Б за № 47812 на імя Пратасевіч П. Н. кв. 1891.
Квіт аб здачы на папраўку галёшняка за № 5321 на імя Мэндзярыцкага кв. 1892.
Пашпарт, выдадзены Заслаўскай раймілыцыяй, на імя Засубіцкі С. Г. кв. 1893.

Уваўпаважаны Галоўлітбелу № А—54.

Друкарня імя Станіна.